ЯК ДАГЛЯДАЦЬ КАЛОДЗЕЖ 3

ЦІ МОЖНА ПАЗБЕГНУЦЬ ГІПЕРТАНІІ? 5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

8 ЛІПЕНЯ 2020 г. СЕРАДА

№ 130 (29244)

ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У БЕЛАРУСІ РЭФОРМА МОЖА БЫЦЬ ТОЛЬКІ Ў АДНЫМ КІРУНКУ — ЯК УДАСКАНАЛЕННЕ ТАГО, ШТО Ў НАС ЁСЦЬ»

Амаль тры гадзіны доўжылася сустрэча Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі са сталічным актывам

Фота БелТА.

У адміністрацыйным комплексе на праспекце Пераможцаў сабралася каля тысячы чалавек — члены Мінгарвыканкама, парламентарыі, кіраўнікі дзяржаўных органаў, сілавых структур і ведамстваў, адміністрацый раёнаў Мінска, акцыянерных таварыстваў, прадпрыемстваў камунальнай формы ўласнасці, установ адукацыі і аховы здароўя, грамадскіх аб'яднанняў.

Аб сітуацыі ў сталіцы Прэзідэнту далажыў старшыня Мінгарвыканкама Анатоль Сівак. Ён расказаў, якім чынам Мінск стане «разумным» горадам з зялёнымі тэхналогіямі, і што галоўная задача зараз — рост даходаў гараджан.

Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні закрануў усе бакі жыцця не толькі Мінска, але і краіны ў цэлым.

Зямля — аснова ўсёй Айчыны

«У Мінск як магнітам прыцягваюцца вытворчыя і фінансавыя рэсурсы, едуць працаваць найбольш кваліфікаваныя кадры. Гэта нядзіўна: Мінск — сталіца, палітычны, эканамічны, культуры і навуковы цэнтр, візітная картка нашай краіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і растлумачыў: таму парадак у незалежнай Беларусі пачалі наводзіць менавіта з Мінска. Сюды былі ўкладзены ўсе наяўныя рэсурсы і сілы.

Цяпер надышла чарга рэгіёнаў, з'явілася магчымасць «аддаць доўг» вёсцы, малым гарадам. У сітуацыі, калі ўсе імкнуцца ў Мінск, глыбінка можа апусцець, заўважыў Прэзідэнт. Таму ў зоне ўвагі дзяржавы на наступныя пяць гадоў — вяртанне беларусаў на зямлю. У прамым сэнсе гэтага слова. Прэзідэнт лічыць важнай магчымасць любому гараджаніну атрымаць ва ўласнасць за сімвалічную плату пустыя ўчасткі на хутарах і ў апусцелых вёсках.

«Такім чынам мы адродзім і неперспектыўныя вёсачкі, будзем развіваць малыя гарады, пасёлкі гарадскога тыпу і людзям створым зручнасці для жыцця. Гэта трэба зрабіць толькі для беларусаў. Закрывацца мы не хочам і не можам, мы экспартаарыентаваная эканоміка. Наша дзяржава не можа жыць, не маючы зносін са знешнім светам. Мы ў геаграфічным цэнтры. Таму нам трэба акуратна, мэтанакіравана паглядзець так на сталіцу і краіну ў цэлым, каб увогуле маёмасць належала беларусам», — абазначыў Прэзідэнт.

Узорны горад

Каб асэнсаваць, якім стаў сучасны Мінск, варта азірнуцца назад. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, у якім становішчы былі сталічныя прадпрыемствы і грамадства, якая была крымінальная абстаноўка ў сярэдзіне 90-х.

«Таму мне давялося дзейнічаць сілай, абапіраючыся на дапамогу простых людзей і асабліва мінчан», — канстатаваў Прэзідэнт. І парадак быў наведзены: дзе праз суткі, як у метро (забастоўка машыністаў), дзе праз месяц, як на трасе Масква—Берлін (разгул бандытызму). У мікрараёнах, якія лічыліся крымінальнымі, узніклі цяпер папулярныя месцы для жыцця, даўгабуды завершаны, а сталіца разбагацела на ўнікальныя будынкі накшталт Нацыянальнай бібліятэкі.

«Мы правялі II Еўрапейскія гульні. Для нас гэта было важна, гэта быў прарыў (калі хочаце, дыпламатычны) нашай краіны ў так званы цывілізаваны свет. Гэта найважнейшае пытанне, а яшчэ мы вельмі моцна падцягнулі Мінск, пабудавалі новыя спартыўныя аб'екты. Нехта крытычна да гэтага ставіцца, а я лічу, што ***«усё, што мы тады стварылі, застанецца нават не нам, а нашым дзецям. І сёння Мінск з'яўляецца ўзорным горадам для правядзення рознага роду спартыўных і культурных мерапрыемстваў»***, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Краіна для медтурызму

Прэзідэнт дадаў, што ў апошнія гады значна ўдасканалена сталічная сістэма адукацыі: з 2016 года ўведзены ў эксплуатацыю чатыры школы, пятнаццаць дашкольных устаноў, пастаянна ўмацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база. А калісьці будынкі дзіцячых садкоў прадаваліся за капейкі, нагадаў кіраўнік дзяржавы.

«Стаўшы Прэзідэнтам, гэты працэс я спыніў. Я разумею, што дзіцячыя сады нам патрэбны будуць. Але шмат ужо было распрададзена ў цэнтры і нам давялося будаваць новыя, у асноўным стваралі ў мікрараёнах. Дзіцячыя сады былі запатрабаваныя, таму што людзі пачалі нараджаць, з'явіліся дзеткі. Тое самае і са школамі», — парадаваўся Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, сёння не хапае некалькіх школ у мікрараёнах, пры гэтым школы ў цэнтры не запоўненыя.

У сталіцы за апошнія чатыры гады ўведзены ў строй чатыры бальніцы, тры паліклінікі, медыцынскі цэнтр у Ждановічах, Мінскі гарадскі анкалагічны дыспансер, падстанцыя хуткай дапамогі. «Усё гэта пазнаецца ў крытычныя моманты. ***Сістэма і кіруемасць у сферы аховы здароўя дапамагла нам у такім густанаселеным і адкрытым горадзе, улічваючы яшчэ нашы метады барацьбы з каранавірусам, пераадолець гэтыя праблемы***... Для мяне было самым галоўным — не дапусціць панікі. Мы гэта з вамі пераадолелі, і дай бог, каб і далей паціху адысці ад гэтай бяды і не дапусціць паўторнай эпідэміі», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

Як ён адзначыў, у якасці медыцынскіх турыстаў Мінск наведалі грамадзяне 105 краін, а экспарт медпаслуг налічвае дзясяткі мільёнаў доларaў.

«Пра што гэта гаворыць? Што наша ахова здароўя ў большасці сваёй прасунутая і запатрабаваная», — зрабіў выснову Аляксандр Лукашэнка.

На электрычцы

Рывок, які зроблены ў развіцці сталічнай транспартнай інфраструктуры, кіраўнік дзяржавы назваў велізарным: рэканструкцыя кальцавой дарогі, найбуйнейшых гарадскіх магістраляў, будаўніцтва развязак у самых праблемных месцах дазваляюць Мінску заставацца камфортным.

СТАР. 2

МЯЧ У ГУЛЬНІ

Фота БелТА.

Юны жыхар Дуброўна Данііл КУПРЭЕЎ разам са сваімі равеснікамі — аматарамі паганяць мяч атрымаў учора шыкоўны падарунак. На тэрыторыі 2-й гарадской школы, якая знаходзіцца ў густанаселеным мікрараёне, адкрылі новую футбольную пляцоўку. Цяпер малым аматарам гульні будзе дзе трэніравацца, і, магчыма, хутка аб невялікім гарадку Дуброўна, што на Віцебшчыне, загавораць як аб новай сталіцы футбола, бо на сёння ў раёне ён вядучы від спорту.

На ўзроўні

НОВАЕ АБСТАЛЯВАННЕ ДЛЯ СУДОВЫХ ЭКСПЕРТАЎ

Днямі Дзяржаўнаму камітэту судовых экспертыз споўнілася сем гадоў. Да гэтай даты быў прымеркаваны запуск найноўшага спецыялізаванага комплексу для падрыхтоўкі спецыялістаў. Размясціўся ён на базе Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ведамства.

Фота БелТА.

— Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу — забяспечыць якасную падрыхтоўку кадраў, — адзначае **старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэй ШВЕД**. — І сёння мы можам казаць, што яна выконваецца эфектыўна. Але гэта можа быць толькі дзякуючы двум складнікам — высокакваліфікаваным, сумленным, старанным экспертам і сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базе. Штогод мы ўкараняем новыя віды экспертыз. Адпаведна, трэба рыхтаваць людзей. Толькі за апошнія пяць гадоў у сценах інстытута асвоена 18 новых спецыяльнасцяў, што адпавядае неабходнасці падрыхтоўкі кадраў па многіх відах экспертыз.

СТАР. 2

IT-краіна

ПАПЯРОВЫ ПРАЯЗНЫ ЎЖО АБЛІЧБАВАНЫ

Smart-квіткі на праезд сталі даступныя ў грамадскім транспарце Мінска і яшчэ ў двух гарадах

У першай дэкадзе ліпеня жыхары адразу трох гарадоў далучыліся да тых, хто можа скарыстацца бескантактавай аплатай праезду ў грамадскім транспарце з дапамогай QR-кода. Сэрвіс «аплаці ™» укаранілі на аўтобусах Слоніма і Ваўкавыска. У Мінску інавацыйная тэхналогія стала даступная на тралейбусным маршруце № 77 (напрамак: Сапёраў — ДС Сухарава-5).

Варта адзначыць, што тэхналогію рэалізавалі Белінвестбанк, часткай экасістэмы якога і з'яўляецца сэрвіс, і кампанія LWO — рэзідэнт Парка высокіх тэхналогій. У smart city — сталіцы сістэму прапанавалі ў абноўленым, яшчэ больш інавацыйным фармаце.

Білеты на праезд у грамадскім транспарце і праязныя квіткі цяпер захоўваюцца проста ў смартфоне пасажыра. Для іх набыцця не трэба кантактаваць з наяўнымі грашыма. Няма неабходнасці і перадаваць білет на праверку кантралёру, бо ўвесь працэс (і пакупкі, і праверкі) — бескантактавы, у ім задзейнічаны толькі QR-код і тэлефон. Зручна, хутка і, галоўнае, бяспечна.

Аўтобус са спецыяльнай налепкай

Пра тое, што ў транспартным сродку можна набыць квіток у электронным выглядзе, сігналізуе апазнавальная налепка «Аплаці. Транспарт». У салоне размешчаны QR-коды, з дапамогай якіх і набываецца білет на праезд. Гэтая тэхналогія ўжо шырока вядомая жыхарам усіх абласных цэнтраў краіны, а таксама Бабруйска, Баранавіч, Пінска, Ліды, Оршы, Кобрына, Наваполацка і Вілейкі. Днямі яе апрабавалі ў Слоніме і Ваўкавыску.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Елісейскі палац назваў новы склад урада Францыі

Усяго ў кабінеце, які ўзначальвае прэм'ер-міністр Жан Кастэкс, 16 міністраў і 14 віцэ-міністраў. Інфармацыю па кіраўніках ведамстваў агучыў генеральны сакратар Елісейскага палаца Алексі Калер. У адпаведнасці з абяцаннем прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона ў кабміне захаваны гендарны парытэт. Перафарміраванне ўрада адбылося ў сувязі з сыходам у адстаўку ранейшага прэм'ер-міністра Эдуара Філіпа, які вырашыў завяршыць свае трохгадовыя паўнамоцтвы на чале кабінета ў сувязі з выбраннем мэрам буйнога партовага і дзелавога цэнтра Гаўра. Як заявіў напярэдадні ў сваім Twitter Эмануэль Макрон, галоўнымі задачамі новага ўрада стануць «аднаўленне эканомікі і сацыяльнай сферы, якія пацярпелі ад наступстваў пандэміі каранавіруса, а таксама ахова навакольнага асяроддзя, развіццё французскай культуры і абарона еўрапейскага суверэнітэту». Па словах прадстаўнікоў Елісейскага палаца, прэзідэнт мае намер падрабязна расказаць аб праграме дзеянняў у тэлевізійным інтэрв'ю ў нацыянальнае свята Францыі, якое адзначаецца 14 ліпеня.

У Кітаі і Манголіі адзначаны выпадкі бубоннай чумы

Улады Кітая паведамілі пра выпадак захворвання ў аўтаномнай акрузе Унутраная Манголія, што на паўночным усходзе краіны. Пацыент — мясцовы пастух, які быў шпіталізаваны ў клініку ў горадзе Баян-Нур і знаходзіцца ў стабільным стане. Тым не менш мясцовыя ўлады да канца бягучага года ўвялі ў аўтаномнай акрузе рэжым бяспекі трэцяй ступені. Ён прадугледжвае забарону на ўжыванне мяса жывёл, якія патэнцыйна з'яўляюцца разносчыкамі чумы, і заклік да насельніцтва неадкладна паведамляць аб усіх падазроных выпадках. У суседняй Манголіі з мінулага тыдня выяўлена, па меншай меры, тры выпадкі з падазрэннем на небяспечнае захворванне. Сярод жыхароў Манголіі і кітайскай Унутранай Манголіі існуе звычай паляваць на суркоў і ўжываць іх у ежу. У выніку ўспышкі бубоннай чумы адбываюцца ў гэтых рэгіёнах даволі часта. Адзначаецца, што пры адсутнасці неабходнага лячэння дарослы чалавек можа памерці ад захворвання цягам двух сутак. Сусветная арганізацыя аховы здароўя не лічыць, што ўспышка бубоннай чумы ў Кітаі і Манголіі ўяўляе небяспеку, але яе прадстаўнікі ўважліва сочаць за сітуацыяй, заявіла афіцыйны прадстаўнік СААЗ Маргарэт Харыс.

Зорка амерыканскага футбола стаў самым дарагім спартсменам у гісторыі



Патрык Махоўмс, гулец каманды «Канзас-Сіці Чыфс», зорка Нацыянальнай лігі амерыканскага футбола (НФЛ), падпісаў дзесяцігадовы кантракт, які стаў рэкордным у гісторыі не толькі гэтага клуба і адпаведнага віду, але і прафесійнага спорту ў цэлым. Як пішуць амерыканскія СМІ, сума мегакантракта перавышае паўмільярда долараў. Махоўмс «абышоў па грашах» іншых зорак НФЛ як мінімум на 10 мільёнаў долараў у год. Прычым квотэрбэк «Канзас-Сіці Чыфс» паставіў рэкорд не толькі па суме, але і па працягласці кантракта — у іншых гульцоў лігі яна не перавышае пяці гадоў. Па суме здзелкі Махоўмс апярэдзіў ранейшага прафесіянала-рэкардсмена, амерыканскага бейсбаліста Майка Траўта, які летась падпісаў 12-гадовы кантракт з клубам «Лос-Анджэлес Энджэлс» на суму 426,5 мільёна долараў.

Патрык Махоўмс выступае за «Канзас-Сіці Чыфс» з 2017 года. У мінулым сезоне клуб упершыню з 1970-га стаў чэмпіёнам НФЛ, выйграўшы Супербоўл у «Сан-Францыска», а Махоўмс быў прызнаны самым каштоўным гульцом гэтага матча.

КАРАТКА

- **Залатавалютныя рэзервы Беларусі за чэрвень выраслі на 11,6 % да $8,8 млрд.**
- Сэрвіс пошуку прафесійных сядзелак можа з'явіцца ў Мінску ў 2021 годзе.
- **ПА АБСЕ не зможа накіраваць назіральнікаў на прэзідэнцкія выбары ў Беларусь.**
- Экспазіцыя архітэктурных макетаў пад адкрытым небам пачала работу ў Лясхавічах.

- **Два пункты пропуску на беларуска-ўкраінскай мяжы вярнуліся да ранейшага рэжыму работы.**
- «Белавія» аднаўляе штодзённыя чартарныя палёты ў Чарнагорыю з 10 ліпеня.

Купалаўскімі сцежкамі

З «Паўлінкай у Акопах»

пабывала карэспандэнт «Звязды», пачаставалася «Дзіцячай радасцю» і «Пчаліным пацалункам»

Менавіта такі інтэрактыўны праект арганізавалі ў філіяле літаратурнага музея па матывах п'есы Янкі Купалы «Паўлінка». Музей знаходзіцца ў вёсцы Харужынцы (раней сядзіба Міхалішкі), за два кіламетры ад таго месца, дзе стаяў фальварак сям'і Купалы. Тут жылі яго маці, сёстры. Пясняр прыязджаў сюды з 1911 да 1913 года. Для паэта гэты фальварак быў месцам творчасці. І даволі плённай. У Акопах напісаны паэмы «Бандароўна», «Магіла льва», «Яна і я», п'есы «Раскіданае гняздо», «Прымакі», «Тутэйшыя», больш як сто вершаў. І вядома ж, знакамітая «Паўлінка».

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

«У БЕЛАРУСІ РЭФОРМА МОЖА БЫЦЬ ТОЛЬКІ Ў АДНЫМ КІРУНКУ — ЯК УДАСКАНАЛЕННЕ ТАГО, ШТО Ў НАС ЁСЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Чацвёртае месца мы займаем сярод шаснаццаці метрапалітэнаў СНД, будуем трэцюю лінію — у хуткім часе ўвядзём яе ў строй і разгрузім яшчэ больш наш горад. Вы ведаеце, што я патрабую ад урада і гараджан пераходзіць на электрамабілі, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — ***...Адна з асноўных задач, якую мы вырашым у наступнай пяцігодцы, — гэта пераход на электрамабілі. Мы проста не павінны тут адстаць».***

І ўвядзенне ў эксплуатацыю атамнай электрастанцыі будзе гэтаму садзейнічаць.

«Я часта аб гэтым казаў, калі мы пачыналі яе будаваць, каб вас пераканаць, што нам трэба яе пабудаваць, — мала таго, што гэта экалагічна чыстае паліва. ***Бяспека важная, безумоўна, але сёння ўжо навучыліся будаваць бяспечныя ядзерныя рэактары. Беларусь літаральна акружаная атамнымі станцыямі. А нам нельга?!*** Мы пабудавалі сваю атамную станцыю. А зараз ідзе барацьба, схаваная, праўда. Я яе бачу. Хто будзе абслугоўваць? Гэта ж найвышэйшыя тэхналогіі. Мы. Акрамя рэактараў. Рэактар павінны абслугоўваць тыя, хто яго будаваў. Гэтыя тэхналогіі нікому не перадаюцца. Мы не проста пабудавалі атамную станцыю — мы навучыліся будаваць такія аб'екты», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы і паведаміў, што краіны блізкага замежжа ўжо просяць дапамогі ў будаўніцтве АЭС.

Такім чынам Беларусь тэхналагічна ўзнімаецца на новую вышыню — і гэта галоўны аргумент пры прыняцці рашэнняў па БелАЭС, касмічнай сферы і сферы інтэлектуальных тэхналогій.

«Мы вельмі шмат ствараем тых галін, якіх у нас не было. Гэта адзінкавыя экзэмпляры, бо для гэтага трэба вельмі шмат грошай. І ў нас няма такога досведу — гэтаму трэба вучыцца нанова», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

У Нацыянальным аэрапорце пабудавана другая ўзлётна-пасадачная паласа, ідзе чарговы этап рэканструкцыі. А ў найбліжэйшыя гады, паведаміў Прэзідэнт, да паветранай гавані будзе падведзена электрычка з чыгуначнага вакзала Мінска: «Я нядаўна зацвердзіў гэты праект, мы вызначыліся, дзе будзе перон для выхаду. ***І такім чынам аб'яднаем наш аэрапорт — прыгожы, вельмі ўтульны — з горадам-героем Мінскам шляхам чыгуначных зносін»***.

Каб не былі жабракамі

Па словах Прэзідэнта, Мінск аб'ектыўна задае тон па многіх сучасных кірунках. Прыклад — унікальны Парк высокіх тэхналогій, экспарт якога летась перавысіў два мільярды долараў. У ПВТ звыш 800 кампаній-рэзідэнтаў і 63 тысячы супрацоўнікаў.

«Лічбу» трэба хутчэй укараняць у нас у эканоміцы, сацыяльнай сферы. Мы ж ІТ-краіну вырашылі пабудаваць. І дзе гэта рабіць перш за ўсё, як не ў Мінску? ***Інфармацыйныя тэхналогіі — гэта «разумны» горад, паслугі, грамадская бяспека. Без гэтага горад спыніцца ў развіцці. Пры гэтым непарушнае патрабаванне: усё павінна быць зручным і камфортным як для жыхароў, так і гасцей нашай сталіцы»***, — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. І зноў папярэдзіў: ІТ — гэта добра, але ў аснове ўсяго быў і будзе (і павінен застацца) чалавек.

Менавіта людзей Прэзідэнт лічыць найбольш запатрабаванымі ў агляднай будучыні. Прынамсі, эканоміка горада, якая расце і атрымлівае меры падтрымкі, садзейнічае штогадоваму з'яўленню пяці тысяч суб'ектаў гаспадарання.

Аснова сталічнага вытворчага комплексу — прадпрыемствы аўтамабілебудавання, электратэхнічнай, фармацэўтычнай, харчовай гаспадаркі.

«Мы не дапусцілі бяздумнай прыватызацыі нашых гігантаў», — падкрэсліў лідар Беларусі.

І той, хто хоча працаваць, мае шмат магчымасцяў для гэтага.

«Калі вы хочаце бізнесам займацца, вы, калі ласка, займайцеся, і глядзіце, каб вашы работнікі не былі жабракамі. А ўзровень зарплаты я вам на гэты год давёў, а наступны год чакайце новы ўзровень. І барані вас бог, вы не заплаціце людзям. Я не кажу, што вы пагалоўна гультаям павінны плаціць. Вы самі прымаеце на работу людзей і будзьце ласкавыя забяспечыць іх работай і годнай заработнай платай», — звярнуўся да бізнес-суполкі Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што бізнес-клімат Мінска — адзін з найлепшых у СНД і спрыяльны нават на сусветным фоне: на чацвёртым месцы па эканамічнай эфектыўнасці вядзення бізнесу сярод еўрапейскіх гарадоў і рэгіёнаў будучыні. Летась беларуская сталіца ўвайшла

Фота БелТА.

ў лік дзесяці еўрапейскіх гарадоў, якія абавязкова варта наведаць.

«Беларуская сталіца — прызнаная культурная пляцоўка», — працягнуў кіраўнік дзяржавы. Каб у гэтым упэўніцца, прапанаваў прайсціся па вуліцах сталіцы, дзе размешчаны тэатры, галерэі, канцэртныя залы. У беларускіх дзеячаў мастацтваў ёсць усе магчымасці для творчасці.

У гарады-спадарожнікі

Падчас сустрэчы зайшла гутарка і аб праблемах. Галоўнай Аляксандр Лукашэнка назваў адрыў кіраўніцтва горада ад рэальных патрэб людзей, бюракратызм і карупцыю.

«Карупцыя — гэта ржа, якая раз'ядае не толькі эканоміку, але і грамадства, увесь уклад, які мы стварылі. Увогуле я вас не хачу ў гэтым плане пераконваць. Усе ў свеце ацанілі Беларусь як краіну з самай нізкай карупцыяй. Таму што нам не трэба плаціць узнагароду, каб сюды прыйсці. Калі нехта жадае інакш — я не ваш прэзідэнт. І вы не галасуйце за мяне. ***Карупцыя — гэта знявага чалавека. І я не хачу, каб Беларусь пагрузілася ў гэтую дрыгву***, як нашы суседзі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён заклікаў не губляць сувязь з грамадзянамі і асабліва з моладдзю, а пасля выбараў не астываць і не самазаспакойвацца. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, належыць умацаваць і выканаўчую, тэхналагічную дысцыпліну, якая непасрэдна ўплывае на якасць прадукцыі, а значыць, і на экспарт. Без экспарту (і валюты) краіна жыць не будзе, папярэдзіў Прэзідэнт.

«Асаблівую ўвагу нам трэба звярнуць у цэлым на горад. Ён павінен быць узорам ва ўсіх адносінах. Пакуль агульнагарадская чарга тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, налічвае амаль 200 тысяч сем'яў. Не вырашана задача па затрыманні росту насельніцтва сталіцы на ўзроўні не больш за два мільёны чалавек — а пажадана спыніцца на цяперашнім узроўні», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Перанасялення дапусціць нельга ні ў якім выпадку, Мінск павінен застацца ў межах першай кальцавой дарогі, — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі нехта думае, што мы гэтую зялёную зону, паркі і іншыя пачнём падразаць і там нешта будаваць, жыллё... Гэтага не будзе. Гэта набытак людзей. Не ўсе могуць паехаць на Балі ці Гаа. А вось з дзеткамі перайсці цераз дарогу і пайсці ў парк адпачыць... Там нельга нічога больш будаваць», — папярэдзіў ён.

Замест ушчыльнення Мінска, упэўнены лідар Беларусі, трэба будавацца на свабодных землях і ствараць інфраструктуру. «Будзем развіваць гарады-спадарожнікі... Нам удалося крыху збіць цэны, асабліва і перш за ўсё там, дзе людзі стаяць у чарзе. І гэты працэс мы будзем узмацняць. ***Будзем пашыраць будаўніцтва арэнднага жылля — жылля спажывецкіх якасцяў. Нам трэба забяспечыць перш за ўсё людзей, якія не маюць жылля»***, — заявіў Прэзідэнт.

Прадпрыемствы — з цэнтра

Задача Мінска — аднавіць усе эканамічныя сувязі пасля адкрыцця граніц і аднавіць экспартны патэнцыял як мінімум на леташнім узроўні, адзначыў Прэзідэнт.

«Што мы сёння падаем, гэта наша бяда, а не наша віна. Мы нічога не закрывалі, але наўкол усё закрытае пакуль. Трэба на Мінск паглядзець сур'ёзна, мабыць, вярнуцца яшчэ да Генеральнага плана, канчаткова зацвердзіць яго і прадставіць мінчанам, каб яны разумелі, як будзем рухацца ў наступную пяцігодку», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на неабходнасць эфектыўнага карыстання дзяржаўнай маёмасцю. Вынас прадпрыемстваў з цэнтра горада будзе працягнуты, на старых пляцоўках магчыма развіваць чыстыя вытворчасці.

«Задач вельмі шмат, задачы вельмі няпростыя. І рэформамі гэтыя задачы не вырашыш. Паколькі шмат кажуць аб «пераменах», я вам павінен сказаць, як я разумею гэтыя рэформы і як мы ішлі па жыцці, рэфармуючыся. ***У Беларусі рэформа можа быць толькі ў адным кірунку — як удасканаленне таго, што ў нас ёсць. Мы маем адпаведныя кампетэнцыі, мы маем адпаведныя школы. Дык нам лепш інвеставаць у гэта, дзе мы штосьці разумеем***. Навошта нам ствараць на голым месцы, імкнуцца зламаць і новае пабудаваць? Мы павінны самі будаваць свае вытворчасці, уводзіць іх у строй, яны павінны плаціць падаткі. Таму нам трэба акуратней быць і з замежнымі інвестарамі — трэба падтрымліваць сваіх», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Супрацоўнічаць дзяржава гатовая з кожным, хто прапануе нешта новае і карыснае.

«У нас задачы велізарнай важнасці, якія мы павінны рашыць. І рэформа — гэта ***будзем удасканальваць, паглыбляць і пашыраць, што мы ўмеем рабіць***. Таму рэформы і яшчэ раз рэформы, але як удасканаленне таго, што ў нас ёсць: ці то адукацыя, ахова здароўя, прамысловасць ці сельская гаспадарка. Трэба «ўстаць на плечы гігантаў» і ствараць новае», — заключыў Прэзідэнт.

Варвара МАРОЗАВА.

Меркаванні

ЁСЦЬ ШАНЦ У КОЖНАГА

Фота БелТА.

Яўген АРШАНСКІ, прафесар кафедры хіміі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, доктар педагагічных навук, прафесар:

«Калі чытаю ў інтэрнэце размовы наконт таго, каб «выйсці на плошчу», становіцца, мякка кажучы, непрыемна. Адназначна лічу, што ніякія пытанні: ад асабістых да тых, якія датычацца многіх, на вуліцы вырашацца не могуць...

Тым больш як прафесійны хімік, магу канстатаваць, што вельмі важная ўстойлівасць сістэм, стабільнасць. Жыццё ў Беларусі стабільнае, а з іншага боку, відавочна, што краіна імкліва развіваецца.

Зразумела, дзяржава, грамадства павінны развівацца, і такая магчымасць павінна быць у кожнага. У гэтым сэнсе нам пашанцавала, у нашай краіне ёсць шанц атрымаць вельмі добрую адукацыю, праявіць свае здольнасці, зрабіць навуковую кар'еру ў іншых сферах.

І развіццё закранае практычна ўсе бакі жыцця. Як чалавека навукі мяне сёння радуе прагрэс у самых розных навуковых кірунках: бія- і нанаіндустрыі, прыборабудавання, атамнай энергетыкі і іншых.

Пры гэтым бясспрэчна, што развіццё навуковых сфер закранае не толькі сталіцу, але і рэгіёны. У прыватнасці, у нашым універсітэце мадэрнізуюцца і адкрываюцца новыя навуковыя лабараторыі, нават лабараторыя штучнага інтэлекту.

А як чалавека, які займаецца праблемамі адукацыі, мяне радуе, што сёння ўзяты курс на ўзмацненне практыкаарыентаванаскіраванасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Паспяхова развіваецца сістэма агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Ёсць усе магчымасці для падрыхтоўкі з улікам самых сучасных патрабаванняў. Многія мары ўжо ўвасабляюцца ў жыццё. Напрыклад, у нас ва ўніверсітэце ў хуткім часе адкрыецца лабараторыя ІТ-тэхналогій і метадаў навучання хіміі.

Зразумела, што акрамя навукі і адукацыі яшчэ ёсць звычайнае жыццё... Паглядзіце, мы жывём у чыстай і ўтульнай краіне. Я заўсёды з гонарам паказваю прыгажосць Прыдзвіння маім замежным сябрам. Вельмі прыемна чуць словы пра тое, што тут хочацца застацца...

Як кажуць у народзе, як грыбы пасля дажджу растуць новыя дамы і цэлыя мікрараёны. Літаральна на вачах у Віцебску становіцца ўсё большым мікрараён Білева. Пры гэтым паралельна вядзецца добраўпарадкаванне старых раёнаў горада. Мне вельмі падабаецца Віцебск, які па праве можна назваць адным з самых прыгожых не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй постсавецкай прасторы. Горад на берагах Заходняй Дзвіны — радзіма Марка Шагала, авангарду у мастацтве, аўра Віцебска натхняла і будзе натхняць творчых людзей...

Грамадзянам нашай любімай Беларусі трэба не забываць, што ў краіне, якая ў цэнтры Еўропы, ёсць нямала вельмі добрых сацыяльных гарантый, якія ім дае дзяржава. Сёння, напрыклад, у сувязі з пандэміяй многія ацанілі перавагі бясплатнага медыцынскага абслугоўвання. Ды і да яе высокі ўзровень медыцыны быў гарантыяй добрых дыягностыкі, лячэння і рэабілітацыі.

Наконт узроўню жыцця. У народзе кажуць, што грошай заўсёды мала, але сёння заработная плата дазваляе ўтрымліваць сям'ю. А нядаўна абвясцілі аб меркаваным павышэнні пенсій.

Усё гэта магчыма толькі пры ўмове стабільнасці і выразнага кіравання краінай, якое я бачу сёння. Менавіта таму я заўсёды падтрымліваў і буду падтрымліваць існуючую палітыку дзяржавы. Шчыра веру, што Беларусь будзе развівацца, карыстацца павагай на міжнароднай арэне і прырастаць лепшым.

НОВАЕ АБСТАЛЯВАННЕ ДЛЯ СУДОВЫХ ЭКСПЕРТАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Андрэй Швед адзначыў, што такая ўстанова на постсавецкай прасторы ўнікальная. Тут сабраныя ўсе магчымасці для падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы судовай экспертызы. У тым ліку — і замежных. Што, у сваю чаргу, забяспечвае трывалы прыток валюты ў краіну:

— Толькі за апошні год больш за 1000 экспертаў, у тым ліку 70 з іншых краін, прайшлі ў нас перападрыхтоўку. На некаторых спецыяльнасцях у інстытуце тэрмін навучання складае паўтара года. Пул заявак на найбліжэйшыя гады ўжо складзены. Бюджэт атрымаў больш за 200 тысяч долараў. Асноўная частка гэтых грошай выдаткаваная на набыццё сучаснага абсталявання для патрэб інстытута. У гэтым ёсць свая спецыфіка. Так, мы імкнёмся ўкараняць у нашу работу ўсе беларускія распрацоўкі, але ёсць сегмент тэхнікі, які вырабляецца толькі ў замежжы — Злучаных Штатах Амерыкі, Японіі, Паўднёвай Карэі, Германіі.

Мадэрнізацыя вучэбнай базы ішла паўтара года. У Інстытуце арганізаваны навучальныя лабараторыі па розных кірунках судовай экспертызы, абсталяваныя сучаснымі адмысловымі комплексамі. У лабараторыі судова-медыцынскіх даследаванняў маецца сістэма сканавання гісталагічных прэпаратаў. Ва ўсёй краіне такіх толькі чатыры. Сярод яе магчымасцяў — алічбоўка і маштабаванне малюнка пад мікраскопам у рэжыме рэальнага



Фота БЕЛТА

часу з магчымасцю трансляцыі праз інтэрнэт. Гэта дазваляе, між іншым, калегіяльна разглядаць атрыманыя вынікі падчас анлайн-дэманстрацыі, што ў сваю чаргу павялічвае практычную скіраванасць навучання. Пры неабходнасці на гэтым прыборы можна праводзіць даследаванні не толькі ў мэтах навучання, але і ў межах расследавання крымінальных спраў.

У інстытуце месціцца шмат іншых лабараторый — лінгвістычная, фоноскапічная, мастацтвазнаўчая, інавацыйных тэхналогій... Вельмі цікавы кабінет, у якім вучаць праводзіць трасалагічныя даследаванні. Гэта значыць, рабіць заключэнні па пакінутых матэрыяльных слядах. Чаго тут толькі няма ў якасці прадмета навучання — замкі, дзверы, вопратка...

— У гэтым кабінеце мы вучым высвятляць прыкметы ўзлому замкоў, адбіткаў пальцаў, слядоў абутку, фарбавальных сродкаў, — каментуе **прарэктар па навучальнай рабоце Вадзім ПАЗНЯК**. — Таксама ў нашай кампетэнцыі — складанне цэлага па фрагментах. Напрыклад, чалавек разбіў фару ў аўтамабілі і з'ехаў з месца ДТЗ. Задача эксперта — сабраць усю «мазаіку», каб высветліць, як прыйшоўся ўдар.

Адна з задач лабараторыі, прызначанай для спецыяльных экспертыз, — навучыць эксперта адбіраць для даследаванняў пахі. А таксама — абыходзіцца са спецыяльнай тэхнікай у палявых умовах.

— Нязменны атрыбут судовага эксперта, з якім ён адпраўляецца на выезд на месца здарэння, — гэта спецыялізаваны чамадан з рознымі прыстасаваннямі, — адзначае **старшы выкладчык Таццяна ДУДКО**. — Цяпер яны таксама робяцца ў Беларусі. Чамадан гэты важыць 12 кілаграмаў. На першы погляд — шмат. Але ўзмоцнены корпус мусіць быць для таго, каб эксперт мог размясціцца на любой мясцовасці, каб спакаваць пробы ці запоўніць працэсуальныя дакументы. Ён жа не будзе цягаць з сабой у палі і лясы адмысловае крэсла.

Таццяна Дудко дэманструе некалькі інструментаў, якімі карыстаюцца судовыя эксперты. У іх арсенале ёсць звычайныя рулеткі, але на змену ім ужо прыходзяць лазерныя дальнамеры. Яны незаменныя ў цяжкадаступных месцах. Яшчэ адзін прыбор дазваляе высветліць наяўнасць праводкі ў сценах. Ёсць у эксперта і партатыўны цеплавізар — для вымярэння тэмпературы аб'екта на адлегласці.

Асаблівы гонар інстытута — спецыяльны крыміналістычны палігон. Ён дазваляе ў сціслыя тэрміны змадэляваць любую абстаноўку месца здарэння. Гэта трэба для таго, каб будучыя спецыялісты вучыліся працаваць у самых розных сітуацыях.

— На ім стажоры могуць пабачыць, як след з месца здарэння забіраецца на месцы здарэння, трапляе да эксперта і як ён з ім працуе, — заўважае **рэктар інстытута Ірэна ЛАПІНА**. — Першы допуск, які атрымлівае эксперт, — гэта агляд месца здарэння... Акрамя таго, пры дапамозе спецыялізаванага кулеўлоўніка можна на практыцы спасцігаць тонкасці балістычнай экспертызы. Ёсць нават прыстасаванне для вымярэння нацяжэння цецівы ў арбалетах.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

❍ У тэму

ЛАБАРАТОРЫЯ ДЗЯРЖКАМІТЭТА СУДОВЫХ ЭКСПЕРТЫЗ УВАЙШЛА Ў ТРОЙКУ НАЙЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ

Лабараторыя даследавання нафтапрадуктаў і гаруча-змазачных матэрыялаў Дзяржкамітэта прымала ўдзел у даследаванні Round Robin, у якім спаборнічалі 19 лабараторый з 16 краін свету, паведамілі БелТА ў ДКСЭ.

Трэба было вызначыць від двух разліваў нафтапрадукту, выяўленага ў выглядзе плям на прыбярэжнай тэрыторыі Іспаніі. Акрамя гэтага, неабходна было высветліць знешнія фактары навакольнага асяроддзя, якія паўплывалі на хімічны састаў разлітага нафтапрадукту, выявіць крыніцу забруджвання.

Узорамі для параўнання сталі пробы, якія ўзялі з маторнага адсека судна, заўважанага ў месцы разліву за некалькі дзён да выяўлення плям нафтапрадуктаў. Выкарыстоўваліся матэрыялы, узятыя на нафтаперапрацоўчым заводзе, які знаходзіцца побач з месцам разліву.

Справаздачу беларускіх экспертаў камісія ацаніла на 96 балаў са 100 магчымых. «Ацэньваліся якасць атрыманых даных, правільнасць вызначэння тыпу нафтапрадуктаў і падабенства паміж імі, паўната і дэталізацыя заключэння», — адзначылі ў ведамстве.

ПАПЯРОВЫ ПРАЯЗНЫ ЎЖО АБЛІЧБАВАНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для аплаты праезду бескантактавым спосабам пасажыру неабходна навесці сканер на QR, убудаваны ў праграму «аплаці ™», выбраць колькасць квіткоў для пакупкі і, калі на экране смартфона высвеціцца сума для аплаты, націснуць кнопку «Аплаціць». Грошы тут жа спішуцца з электроннага кашалька пасажыра. А на экране смартфона з'явіцца білет. Каб яго набыць, набліжацца да QR-кода не трэба. Счытванне адбываецца з адлегласці да 2—2,5 метра. Ніякіх лішніх кантактаў, пошуку дробязі — усё спрошчана да некалькіх клікаў.

Новая версія для Мінска

Што датычыцца жыхароў сталіцы, ім прадстаўлена абноўленая версія сістэмы «Аплаці. Транспарт» з новымі ўнікальнымі магчымасцямі. У ёй мінчане змогуць купіць smart-білет не толькі па QR-кодзе, але і яшчэ двума спосабамі.

У транспартных сродках, абсталяваных блютуз- і wf-пазнакамі, праграма «аплаці ™», усталяваная на смартфоне, сама іх распазнае і адразу прапануе набыць квіток на праезд. Акрамя таго, прадугледжаны яшчэ адзін «экстранны» варыянт аплаты — па гаражным нумары транспартнага сродку. Знайсці яго проста — на налепках проста пад QR-кодам.

«За чатыры месяцы мы змаглі падключыць да сістэмы 17 гарадоў. Усяго гэта каля паўтары тысячы адзінак транспарту. Штодня з дапамогай сістэмы прадаецца больш за 12 тысяч білетаў, — адзначыў **намеснік старшыні Праўлення ААТ «Белінвестбанк» Андрэй САКІРКА**. — Прыемна, што сэрвіс развіваецца не толькі на транспарце. Да «аплаці ™» падключыліся чатыры буйныя розничныя гандлёвыя сеткі: «Віталюр», «Суседзі», «Санта» і «Карона». Актыўна далучаюцца прадпрыемствы мікра-, малога і сярэдняга бізнесу, якім патрэбны танны і зручны сэрвіс для хуткіх і празрыстых разлікаў».

Праязны купляю дома

Магчымасці праграмы пастаянна пашыраюцца. Не так даўно для тых, хто часта перамяшчаецца на грамадскім транспарце, быў аблічбаваны і папяровы праязны. Яго можна набыць на месяц або на любую з трох дэкад. Пакуль магчымасць куплі электроннага праязнога была даступная жыхарам Барысава, Вілейкі, Кобрына, Ліды, Наваполацка, Оршы і Пінска. Сёння такая магчымасць з'явілася ў пасажыраў Ваўкавыска і Слоніма.



Дарэчы, электронны праязны можна купіць не толькі ў аўтобусе, але і дома або ў офісе. На галоўнай старонцы праграмы сэрвісу побач з раздзелам «Мае квіткі» націсніце на значок «Купіць». На старонцы вы ўбачыце спосабы аплаты і раздзел «Праязныя білеты». Са спіса выберыце горад, від транспарту і перыяд дзеяння праязнога. Пасля аплаты дакумент захаваецца ў раздзеле «Мае білеты».

Электронны праязны не знікне, нават калі вы вырашыце змяніць свой смартфон. Вам проста неабходна нанова спампаваць сэрвіс. Калі ўвойдзеце ў сістэму, ваш праязны зноў з'явіцца ў праграме, але ўжо на новым тэлефоне.

У кожным горадзе традыцыйна ўкараненню тэхналогіі папярэднічае навучанне кантралёраў, якія ў выпадку неабходнасці дапамагаюць пасажырам скарыстацца інавацыяй. Схема куплі квітка сапраўды вельмі простая. Адзінае, аб чым лепш паклапаціцца загадзя, усталяваць праграму «аплаці ™» на ваш смартфон. Зрабіць гэта можа любы жыхар краіны незалежна ад таго, кліентам якога банка ён з'яўляецца.

Нагадаем, тэхналогія аплаты праезду на грамадскім транспарце па QR-кодзе ўпершыню была ўкаранёна ў Барысаве. Услед за ім інавацыя стала даступная жыхарам іншых гарадоў. Тэхналогія тыражуецца і ў маршрутных таксі. Аплаціць праезд з дапамогай мабільнай праграмы «аплаці ™» можна ў Мінску на маршруце № 1077 (Сухарава-6 — Камароўскі рынак) і ў Магілёве.

Сяргей КУРКАЧ.

Новыя падыходы

Дарожнай інфраструктуры — належны ўзровень

Падпісанае Прэзідэнтам распараджэнне «Аб дадатковых мерах па вырашэнні актуальных пытанняў жыццядзейнасці насельніцтва» ахоплівае розныя сферы: будаўніцтва, жыллёва-камунальную гаспадарку, транспарт, энергетыку, занятасць і сацыяльнае забеспячэнне, ахову здароўя, адукацыю і іншыя. У тым ліку распараджэнне датычыцца і развіцця дарожнай інфраструктуры. Якая на сёння сітуацыя ў гэтай сферы, мы даведаліся ад спецыялістаў.

Мінтранс распрацоўвае Дзяржаўную праграму развіцця аўтамабільных дарог пад назвай «Дарогі Беларусі» на 2021 — 2025 гады. Пра гэта расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Аляксандр ГАЛАЎНЁЎ:**

— Там будзе новы раздзел, прысвечаны бяспецы дарожнага руху. Назіраючы за дынамікай ДТЗ, мы прыйшлі да высновы, што арганізацыйныя меры сябе вычарпалі. Цяпер наша задача — паляпшэнне дарожнай інфраструктуры для далейшага скарачэння колькасці загінулых і параненых. Гэта сусветная тэндэнцыя, нават ёсць міжнародная праграма Vision Zero, мэта якой — дасягнуць праз 10-15 гадоў нулявога паказчыка загінулых на дарозе. Мы такі вопыт пераймаем і будзем рухацца ў гэтым кірунку.

Таксама ўжо прынята рашэнне аб падрыхтоўцы праграмы па ўстаноўцы дарожных агароджаў. «Мінтранс» сумесна з ДАІ на працягу двух-трох тыдняў яе падрыхтуе. На сёння ў нас 700 кіламетраў дарог першай катэгорыі не мае на раздзяляльнай паласе бар'ерных агароджаў. Зрабіць усё хутка, на жаль, не атрымаецца, гэта планамерная работа. Думаю, за некалькі гадоў мы яе выканаем. Да таго ж кошт такой мадэрнізацыі дастаткова сур'ёзны — прыкладна 140 мільёнаў рублёў».

На пасяджэнні Камісіі па бяспецы дарожнага руху Мінтранса сумесна з МУС і іншымі зацікаўленымі дадзены даручэнні прыняць меры па ліквідацыі пешаходных пераходаў на адным узроўні з аўтадарогамі першай катэгорыі і ўстанавіць бар'ерныя агароджы на раздзяляльных палосах, а таксама на іншых дарогах у аварыйна небяспечных месцах пры падзеле транспартных патокаў сустрэчных напрамкаў.

— Пры перабудове дарог на першую катэгорыю мы сутыкнуліся са значным павелічэннем ДТЗ з жывёламі, — звярнуў увагу Аляксандр Галаўнёў. — Аказалася, што загараджальныя сеткі для вырашэння такой праблемы малаэфектыўныя. Патрабуюцца не толькі яны, але і розныя пераходы для жывёл. Дарэчы, падземныя таксама паказалі недастатковую эфектыўнасць. Як зафіксавалі фотапасткі, іх выкарыстоўваюць толькі дробныя звяры — зайцы, лісы, а буйныя, капытныя жывёлы пад зямлю не ідуць. Таму тут патрэбныя іншыя пераходы: надземныя, біяпераходы, як у Еўропе.

Аляксандр Галаўнёў дадаў, што галоўнае, на яго думку, — правільна вызначыць месца, дзе іх рабіць. «Гэтае пытанне даволі вострае, таму мы вырашылі падключыць навуку. Аб'явілі тэндар па навуковай распрацоўцы мерапрыемстваў па прадухіленні выхаду жывёл на праезную частку дарог. Нацыянальная акадэмія навук гатова з намі працаваць над гэтай тэмай. Спадзяюся, да канца года мы атрымаем першы вынік, што дазволіць абгрунтавана правесці мерапрыемствы, якія дадуць патрэбны эфект», — падагуліў спікер.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Камунальныя стасункі

АДКАЗНАСЦЬ НА ЎЛАСНІКУ

Як правільна абслугоўваць прыватны калодзеж?

Пераважная большасць беларусаў мае доступ да цэнтралізаванага водазабеспячэння. Аднак толькі прадпрыемствы ЖКГ абслугоўваюць больш за 20 тысяч шахтавых калодзежаў па ўсёй краіне. І гэта калі не ўлічваць крыніцы, якія знаходзяцца на прыватных падворках.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што ў Беларусі дзейнічаюць гігіенічныя патрабаванні да крыніц нецэнтралізаванага пітнога водазабеспячэння насельніцтва, якія зацверджаны пастановай Міністэрства аховы здароўя № 105 ад 2 жніўня 2010 года. Менавіта гэтым дакументам карыстаюцца камунальнікі, калі займаюцца абслугоўваннем грамадскіх калодзежаў. Аднак вельмі важна звярнуць увагу на пастанову і ўласнікам, якія самастойна абслугоўваюць свае калодзежы.

—У выпадку з прыватнымі калодзежамі адказнасць за іх стан, якасць вады цалкам ляжыць на саміх уласніках, — адзначае **выканаўца абавязкаў начальніка аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі ДА «ЖКГ Мінскай вобласці» Юлія ЧУБРЫК**. — І вельмі важна прытрымлівацца пэўных правіл, бо менавіта ад гэтага залежыць здароўе і нават жыццё.

Дзе капаць і з чаго рабіць

Перад тым як выбраць месца для калодзежа ў сваім двары, трэба даведацца пра глыбіню грунтавых вод і напрамак іх цячэння, высветліць, як ваш калодзеж будзе ўзаемадзейнічаць з іншымі крыніцамі на суседніх участках і з паверхневымі водамі з вадаёма, што можа быць паблізу. Акрамя таго, трэба абавязкова правесці абследаванне тэрыторыі, каб выявіць магчымыя крыніцы мікробнага ці хімічнага заражэння вады. Напрыклад, вельмі часта тыя ж камунальнікі сутыкаюцца з такой праблемай, як вялікая колькасць нітратаў у грамадскіх калодзежах, а спрыяюць гэтаму сельскагаспадарчыя ўгоддзі, якія знаходзяцца побач.

— Акрамя таго, што крыніца не павінна быць забруджаная, яна павінна знаходзіцца вышэй чым 50 метраў па цячэнні грунтавых вод ад магчымых фактараў забруджвання вады, — тлумачыць спецыяліст. — Калодзеж не трэба размяшчаць у месцах, дзе прысутнічае глебавая дэфармацыя, існуе магчымасць затаплення паводкавымі водамі, у забалочаных месцах ці бліжэй чым за 30 метраў ад магістраляў з інтэнсіўным рухам аўтамабіляў.

Вельмі важна ўдзяляць увагу не толькі месцу размяшчэння крыніцы, але і канструктыўным элементам, з якіх складаецца калодзеж, — зрубу, шахце і водаприёмнай частцы. Напрыклад, той жа зруб павінен быць не ніжэйшы за 70 сантыметраў ад зямлі і абавязкова зачыняцца вечкам ці люкам. Шахту калодзежа лепш за ўсё рабіць з бетонных ці жалезабетонных кругоў. Ніхто не забараняе выкарыстоўваць камень, цэглу ці дрэва, аднак вельмі важна, каб гэтыя матэрыялы не мелі трэшчын, не афарбоўвалі ваду і выкладаліся на цэментных растворах, якія не маюць ніякіх прымесяў. Сцены самой шахты павінны быць вельмі шчыльныя, каб туды не трапілі паверхневыя воды, а на дне калодзежа трэба абавязкова абсталяваць адваротны гравійны фільтр.

Як пачысціць?

Што ж датычыцца якасці вады, то вельмі важна побач з крыніцай не мыць аўтамабіль, не размяшчаць кампост, адходы ці любыя ўгнаенні — усё гэта трэба рабіць не бліжэй чым за 20 метраў ад вашага калодзежа. Каб якасць вады не пагаршалася, чыстку калодзежа разам з бягучым рамонтам трэба рабіць штогод. Пасля кожнай чысткі ці рамонту неабходна праводзіць абавязковую дэзынфекцыю і прамыўку і толькі пасля аналізу вады выкарыстоўваць яе для пітця.

— Самастойна чысціць калодзеж не варта, бо небяспечна. Гэтым займаюцца спецыялізаваныя арганізацыі. Што ж датычыцца прадпрыемстваў ЖКГ, то звычайна яны такія паслугі не аказваюць і пры абслугоўванні грамадскіх калодзежаў самі наймаюць падрадныя арганізацыі для выканання гэтых работ. А вось каб зрабіць аналіз вады, можна выклікаць спецыялістаў мясцовай санітарнай службы ці самастойна прывезці пробы да іх у лабараторыю, — расказвае спецыяліст. — Для прафілактыкі калодзеж трэба чысціць раз на год, напрыклад, тое ж раставанне снегу вельмі псуе ваду. Праводзіць чыстку неабходна і тады, калі вы заўважылі пагаршэнне яе якасці — убачылі глей, мутнасць ці адчулі непрыемны пах. Здараецца і такое, што ў калодзеж трапляе жывёла. У такіх выпадках таксама вельмі важна праводзіць чыстку. Пры гэтым у час яе правядзення і дэзынфекцыі крыніцы карыстацца калодзежам нельга ні ў якім разе.

Вельмі часта камунальнікі сутыкаюцца з такой праблемай, як вялікая колькасць нітратаў у грамадскіх калодзежах, а «спрыяюць» гэтаму сельскагаспадарчыя ўгоддзі, якія знаходзяцца побач.

Звычайна для дэзынфекцыі шахтавых калодзежаў спецыялісты выкарыстоўваюць хлорную вапну і дзвюхтрацінаасноўную соль гіпахларыту кальцыю (ДТСГК). Пры гэтым яе праводзяць двойчы — да ачысткі калодзежа і пасля. У сваю чаргу, падчас ачысткі калодзеж цалкам вызваляюць ад вады, прыбіраюць пабочныя рэчы і глей, ачышчаюць сценкі ад забруджванняў. Усю гразь і глей, якія былі ў калодзежы, вывозяць на палігон ці размяшчаюць у яме, якая знаходзіцца не менш чым за 20 метраў і мае глыбіню як мінімум 50 сантыметраў. Пры гэтым вельмі важна заліць змесціва гэтай ямы 10-працэнтным растворам хлорнай вапны ці 5-працэнтным растворам ДТСГК і толькі потым закрываць зямлёй.

— Калі ж у вадзе застаецца хлор, то яго трэба адпампоўваць да таго часу, пакуль не знікне рэзкі пах. Калі чыстка праводзіцца для прафілактыкі, то папярэднюю дэзынфекцыю можна ўвогуле не рабіць, — тлумачыць Юлія Чубрык. — Калі крыніца была забруджана па мікрабіялагічных паказчыках і праблему пасля ачысткі і дэзынфекцыі вырашыць не ўдалося, то ўласнік павінен перавесці калодзеж у рэжым пастаяннага абеззаражвання да паляпшэння якасці вады, а вось што датычыцца хімічнага забруджвання, то тут уласнік мусіць ужо ліквідаваць крыніцу.

Валерыя КІСЛАЯ.

Стыхія

Непагадзь прыйшла ўвечары

У другой палове дня ў панядзелак на Беларусь прыйшоў актыўны атмасферны фронт. Паўднёвую частку Брэстчыны літаральна накрыў ураган. Вецер здзіраў стрэхі, ламаў дрэвы, адключаў электразабеспячэнне.

Эпіцэнтр стыхіі прыйшоўся недзе на паўднёвы прыгарад абласнога цэнтра. Дарогі ў напрамку Тамашоўкі, Знаменкі, а таксама Маларыты былі літаральна завалены дрэвамі. Супрацоўнікі лясніцтваў і МНС, дарожнікі распілоўвалі іх ноччу, каб да раніцы забяспечыць праезд. У раёне вёскі Гусак у Маларыцкім раёне вецер спляжыў участак лесу, дрэвы ламаліся нібы запалкі, цяпер на іх месцы толькі пакарабачаныя камлі.

У абласным цэнтры таксама паламала нямала дрэў. Напрыклад, побач з суседнім пад'ездам нашага дома па вуліцы Луцкай раніцай стаяла чырвоная «Шкода», «змятая» аграмадным дрэвам. Машына, як сведчыць нумарны знак, 7-га рэгіёна. Вось так бывае: прыехаў чалавек у госці — і такая няўдача напаткала. Спецыялісты кажуць, нельга ставіць машыны паблізу дрэў, а дзе іх ставіць, калі іншых месцаў няма?.. Пазней стала вядома, што побач з названай пацярпелі і іншыя машыны, але яны атрымалі меншыя пашкоджанні.

Як паведамілі ў абласным упраўленні МНС, у выніку праходжання навальнічнага фронту на тэрыторыі вобласці адбылося адключэнне электраэнергіі ў трох раёнах — Брэсцкім, Кобрынскім і Маларыцкім. Без электрычнасці засталіся 34 населеныя пункты, 14 МТФ, два дзіцячыя аздараўленчыя лагеры. У летніках электрычнасць аднавілі за дзве гадзіны, на аб'ектах сельгасвытворчасці — у асноўным да раніцы.

Паводле папярэдніх звестак, пашкоджаны дахі ў сямі жылых дамах і адным аб'екце сацкультбыту ў Маларыцкім раёне, у трох жылых дамах у Кобрынскім раёне. Паведамленняў аб пацярпелых людзях не паступала. Аварыйна-аднаўленчыя работы працягваюцца.

Як зазначылі ў ДВА «Белэнерга», за суткі ў краіне парушалася ўстойлівае энергазабеспячэнне 140 населеных пунктаў. За ноч у 90 % іх энергетыкі вярнулі падачу электрычнасці. Часова без святла заставаліся два дзіцячыя лагеры ў Маларыцкім і Кобрынскім раёнах, а таксама птушкафабрыка.

Непагадзь зачапіла і Мінск. Па звестках дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», апоўначы з-за ўмоў надвор'я быў спынены рух тралейбусаў на бульвары Шаўчэнкі. Затрымка транспарту склала 23 хвіліны.

Паводле інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, больш за ўсё ападкаў за вечар панядзелка і ў ноч на аўторак выпала ў Слуцку — 52 міліметры. На другім месцы — Віцебск, там таксама прайшоў моцны дождж, але ападкаў было менш — 45 міліметраў. А вось на пацярпелай ад ветру Брэстчыне вады вылілася яшчэ меней — 39 міліметраў у Пінску і 35 — у Ганцавічах. Зрэшты, гэта на 30 % перавышае дэкадную норму для ліпеня.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Жыццё не спыняецца

ЗАБЕГУ БЫЦЬ!

Пандэмія каранавіруса не адменіць Мінскі паўмарафон. Яго дэвіз сёлета — «Бяжым разам!», забег пройдзе 13 верасня, і чакаецца, што ён збярэ больш за 40 тысяч чалавек.

Рэгістрацыя на маючы адбыцца забег ужо пачалася, арганізатары маштабнага мерапрыемства адзначаюць, што калі яе дынаміка захаваецца, то Мінскі паўмарафон раней часу дасягне ліміту ў 42 тысячы ўдзельнікаў. Большасць зарэгістраваных пакуль выбрала масавы забег на 5,5 км. А вось больш за ўсё зорных атлетаў выйдзе на паўмарафонскую дыстанцыю ў 21,1 км. Папулярнасцю сярод дасведчаных бегуноў карыстаецца і маршрут працягласцю 10,55 км. «Ужо пацвердзілі свой удзел прадстаўнікі каля 40 краін», — адзначыў **старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ**.

Пераможцы і прызёры сёлета падзеляць 60 тысяч долараў. Прызавымі будуць першыя шэсць месцаў на дыстанцыях 21,1 і 10,55 км, а таксама першыя тры на 5,5 км. Цяпер уступныя ўзносы на паўмарафон стартуюць з 15 рублёў пры рэгістрацыі на самы просты маршрут у 5,5 км. Бясплатна змогуць прабегчы школьнікі, студэнты, пенсіянеры, ліквідатары аварыі на ЧАЭС і людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Максімальна за ўдзел можна заплаціць 100 рублёў — калі падацца на дыстанцыю 21,1 км за дзень да старту.

Асноўны забег на 21,1 км, як і ўсе астатнія, стартуе каля Палаца спорту, пасля чаго перамесціцца на праспект Незалежнасці і зробіць круг пад мостам паміж БДУ і педуніверсітэтам. Пасля гэтага бегуны пройдуць уздоўж вуліцы Карла Маркса, вернуцца на праспект да Купалаўскага тэатра, дабяруцца да плошчы Перамогі, адкуль трапяць на вуліцу Камуністычную і прамчацца па дарогах уздоўж Свіслачы. За Старажоўскай вуліцай маршрут паверне налева і пойдзе праспектам Пераможцаў. Па ім трэба будзе дасягнуць «Мінск-Арэны» і аббегчы яе. Завершыцца забег у цэнтры Мінска — там жа, дзе і стартаваў.

Адзначым, што Мінскі паўмарафон пройдзе пад сярэбраным лэйблам міжнароднай лёгкаатлетычнай асацыяцыі — ён атрымаў яго ў 2019 годзе.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

З «Паўлінкай у Акопах»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэтае месца як ніякае іншае адлюстроўвае тую атмасферу, што хацелі перадаць арганізатары. Паколькі мы жывём у сучасным свеце, то нацыянальны каларыт, эпоха пачатку XX стагоддзя вельмі цікавыя для турыстаў, гасцей, — кажа **дырэктар турыстычнай фірмы «Вегатур» Алена РУСАКЕВІЧ**. — Нашы супрацоўнікі сваімі сіламі стварылі тут тагачасныя пабудовы.

Напачатку я наведала кірмаш, дзе гуло, віравала жыццё, ішоў бойкі гандаль. Рамеснікі хвалілі сваю прадукцыі, ды запрашалі не саромецца, падыходзіць, купляць. Вочы разбягаліся ад выбару. Ну, і вядома, які кірмаш без цыганоў. Яны весела спявалі ды кружыліся ў задорных танцах. Запрашалі ў кола і наведвальнікаў. Некаторыя прымалі запрашэнне і як маглі прытанцоўвалі ў такт музыцы. Ну і, зразумела ж, праяўлялі сваю натуру, чапляліся да людзей, каб пагадаць, хапалі за рукі. Але за парадкам пільна сачыў ураднік. І калі цыгане пераходзілі дазволеную мяжу, ён іх штурхаў у каршэнь і пакрыкваў. На кірмашы я сустрэла і пана Быкоўскага, які ў картузе з чырвонай кветкай гарцаваў на кані паміж гандлёвымі радамі.

Таццяна Нячосава згадала даследаванне, якое праводзілі ў Гарвардзе цягам 70 гадоў, калі пяць пакаленняў урачоў назіралі і перадавалі адно аднаму сваіх пацыентаў. У выніку выйшла кніга, дзе сфармуляваны асноўныя пастулаты шчаслівага і здаровага жыцця. Першы з іх — хварэць можна, але нельга адчуваць сябе хворым. Да любой хваробы трэба ставіцца як да дарожнага здарэння, але нельга яго ўспрымаць як асноўны сцэнарый жыцця. Другі элемент — каханне, а шчаслівы шлюб — надзейная прыкмета даўгалецця. Трэцяя выснова, якую зрабілі вучоныя, — добрыя людзі жывуць даўжэй і шчаслівей, чым злыя, бо варожы настрой — адзін з фактараў рызыкі каранарнай недастатковасці. Важным вучоныя назвалі і клопат пра душу, чаму спрыяюць ёга і медытацыя. І апошні элемент — вучыцца ніколі не позна. Напрыклад, людзі, якія любяць чытаць кнігі, жывуць у сярэднім на шэсць гадоў даўжэй за тых, хто не вітае такі занятак. Бо разумовая актыўнасць станоўча ўплывае на захаванне цвярозага розуму да глыбокай старасці.

БЯСПЕЧНЫ МАНІКЮР

У салоне ці ў дамашніх умовах?

Прыгожыя і дагледжаныя рукі — візітоўка любой жанчыны. Акуратны манікюр характарызуе яго ўладальніцу толькі са станоўчага боку. Але як зрабіць так, каб гэтая рэгулярная працэдура была бяспечная: аддаваць перавагу толькі майстру ў салоне, або можна рабіць яго ў дамашніх умовах? Як не атрымаць небяспечныя інфекцыі, сярод якіх гепатыт В і С, ВІЧ, грыбок і герпес? Пры гэта расказала памочнік урача-гігіеніста Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Таццяна ЛЯШКЕВІЧ.

— Калі вам падабаецца ваш майстар, да якога вы прыходзіце дадому, можаце карыстацца яго паслугамі. Але важна памятаць, што спецыяліст павінен прытрымлівацца ўсіх правіл бяспекі, — адзначае медык.

Ёсць некалькі рэчаў, на якія варта звярнуць увагу, перад тым як даверыцца майстру. Спецыяліст па манікюры абавязаны мець даведку аб стане здароўя з адзнакай аб праходжанні гігіенічнага навучання, якую павінен прад'явіць па вашым патрабаванні. Звярніце ўвагу на тое, што працаваць ён мусіць у аднаразовых пальчатках і масцы. Перад тым як пачаць рабіць манікюр, майстар павінен апрацаваць вашы рукі антысептыкам. Спецыялісту трэба мець у наяўнасці некалькі камплектаў інструментаў, бо апрацоўка кожнага з іх (калі яна адбываецца па ўсіх правілах) займае не менш за дзве гадзіны. Перад пачаткам працэдуры майстар павінен у вашай прысутнасці адкрываць інструмент у спецыяльных крафт-пакетах са стыкерамі, на якіх пазначаны час і дата стэрылізацыі.

Важна памятаць, што калі падчас працэдуры была пашкоджана цэласнасць скурных покрываў, неабходны дэзынфекцыйныя і стэрылізацыйныя мерапрыемствы. А інструмент абавязкова павінен прайсці ўсе этапы апрацоўкі ў строгай паслядоўнасці. Па-першае, гэта дэзынфекцыя. Яна знішчае грыбы, бактэрыі, вірусы і іншыя мікраарганізмы. Калі яе прапусціць, яны могуць трапіць на іншыя прадметы з усімі наступствамі. Па-другое, ачыстка, што дазваляе змыць часцінкі скуры, крыві, рэшткі касметычных сродкаў, пыл, якія не ўдалося выдаліць падчас дэзынфекцыі. Супраць рэшткаў куцікулы ці старога лаку бяссільная нават стэрылізацыйная апрацоўка. Ачыстка праводзіцца спецыяльнымі растворамі ці вібрацыйнымі шчоткамі-абразівамі. Апошні этап — стэрылізацыя — тэрмічнае знішчэнне спор патагеннай мікрафлоры. Для гэтай працэдуры выкарыстоўваецца абсталяванне, якое дапамагае дасягнуць звышвысокіх тэмператур.

Звяртайце ўвагу на гэтыя важныя моманты і памятайце, што ваша здароўе залежыць у тым ліку ад бяспечных паводзін навакольных.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Добрыя навіны

«І БРАМЫ ПЯКЕЛЬНЫЯ НЕ ПЕРАМОГУЦЬ ЯГО...»

У вёсцы Мядзведзічы Ляхавіцкага раёна цягам дзесяці месяцаў ішоў рамонт аргана з больш чым стагадовай гісторыяй. І вось нарэшце ў касцёле святых апосталаў Пятра і Паўла адбыўся доўгачаканы святочны канцэрт.

Навуковы кіраўнік рамонту аргана Аляксандр БУРДЗЯЛЁЎ: «Інструмент пабудаваны з некаторым запасам, з большымі здольнасцямі, чым патрэбна святой імшы, што, несумненна, дае інструменту вялікі канцэртны патэнцыял».

Парафія ў Мядзведзічах адна з найстарэйшых у Беларусі. Першы касцёл тут з'явіўся ў далёкім 1483 годзе, аднак яго то руйнавалі татары, то зачынялі царскія ўлады, і, дарэчы, вяскоўцы тады дайшлі да самога цара...

Нягледзячы на гэта, вярнуць свой храм ім удалося толькі праз 20 гадоў — і тады ж зразумець, што замест старога, драўлянага будынка трэба ўзводзіць новы. Для гэтага прыхаджане ахвяравалі 60 тысяч рублёў (на той час — проста велізарныя грошы!).

Як пашчасціла іх сабраць? Ды, можна сказаць, проста, бо гэта цяпер Мядзведзічы — сціплая вёска на 80 падворкаў. А на пачатку мінулага стагоддзя, як кажуць старажылы, «тут было ўсё сваё: паны, яўрэі, крамы, пякарня, аптэка і нават рэстаран».

Хадзіць да касцёла лічылася за ганаровае правіла, а калі ў 1912 годзе там з'явіўся арган, то ўжо і за свята, бо паглядзець і паслухаць інструмент (на двух паверхах 924 трубы ад некалькіх сантыметраў да пяці метраў), зроблены адным з найлепшых майстроў Пётрам Вайцяховічам з Вільні, хацелася кожнаму.

Так выглядаў касцёл у 1886 годзе.

...«Пры камуністах» на касцёл, а дакладней, на яго памяшканне, былі іншыя планы. Тут збіраліся зрабіць склад альбо клуб, з чым ніяк не пагаджаліся вернікі! Мясцовыя жанчыны цэлымі днямі і нават начамі па чарзе хадзілі ў храм — вартавалі сваю святыню. *«Я з бабай Свірэпіхай часта начавала,* — успамінае **Браніслава ЦЯРПІЦКАЯ.** — *Яна пасцеле нейкага кажуха, сядзе на ім і як быццам спакойна сядзіць, а я дык баюся-баюся. Дрэвы побач вялікія, вецер у іх шуміць, а мне здаецца, што нехта ідзе ўжо, у дзверы ляпае... Колькі разоў вось гэтак дзяжурылі».*

Прычым — не толькі жанчыны. Мужчыны, бывала, таксама часта «прыбіраліся» ў спадніцы — хадзілі разам з жонкамі. І мелі рацыю: тая ж **Ядвіга СВІРЭПА** згадвае, як аднойчы прыехалі камуністы, каб з касцёла нешта забраць, дык яе бабуля Сарафіна з імі так ваявала, што на пару месяцаў трапіла ў турму!

Касцёл святых апосталаў Пятра і Паўла.

...Такім чынам касцёл перажыў абедзве сусветныя вайны, не закрыўся ў пару бязбожніцтва ды атэістычных ганенняў. З часам хіба арган тут замоўк.

Магчымасць адрамантаваць яго з'явілася летась, і ўжо сёлета, калі б не пандэмія, у Мядзведзічах адбыўся б першы Міжнародны фестываль арганнай музыкі. Чакалася, што прыедуць на яго найлепшыя арганісты Расіі, Польшчы, Германіі, нават Нідэрландаў... *«Сыграць на інструменце 1912 года — гонар для любога арганіста. Гэта як дакрануцца да былога, як пабываць у мінулым ці нават у пазамінулым стагоддзі,* — тлумачыць іх намеры **намеснік старшыні Ляхавіцкага райвыканкама Святлана ЮРЛЕВІЧ.**

Адзін з такіх запрошаных гасцей, народны артыст Беларусі **Ігар АЛОЎНІКАЎ** кажа, што ўжо на першай рэпетыцыі зразумеў, наколькі незвычайны гэты інструмент: *«У нас у Беларусі шмат арганаў, якія існуюць стагоддзямі, але, на жаль, не працуюць. Арган у Мядзведзічах адрозніваецца мяккім, пяшчотным гучаннем, вялікім выбарам галасоў і рэгістраў на клавіятурах».*

...Іншымі словамі, касцёл Пятра і Паўла — раней колькі разоў руйнаваны — зноў і зноў аднаўляецца, абнаўляецца і вяртаецца да людзей яшчэ прыгажэйшы і яшчэ даражэйшы... Яму нібыта сам Бог спрыяе! У доказ згадваюцца словы з Евангелля: *«Ты — Пётр (скала), і на гэтай скале пабудуй Касцёл Мой, і брамы пякельныя не перамогуць яго».*

А мясцовыя жыхары ўпэўнены і яшчэ ў адным: майстры з Мінска аднавілі не проста арган — яны зрабілі нешта большае: далі надзею на адраджэнне вёскі.

Таццяна БОЛТУЦЬ, фота аўтара,
г. Ляхавічы.

Весткі з месцаў

Для таго, каб выхаваць патрыётаў...

У 2013 годзе рашэннем Мінгарвыканкама нашай школе было нададзена імя Героя Савецкага Саюза Аляксея Сямёнавіча Бурдзейнага, і тады ж пачаліся работы па стварэнні музейнай экспазіцыі. Настаўнікі разам з вучнямі ды іх бацькамі збіралі дакументы, фотаздымкі, успаміны ветэранаў, рэчы, якія характарызавалі жыццё і побыт людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Тады ж школа наладзіла сувязі з сынам героя Юрыем Аляксеевічам Бурдзейным, саратаўскім ліцэем № 62, дзе знаходзіцца музей Тацынскай танкавай брыгады, з пошукавым батальёнам в/ч 3213...

У выніку ў нас сталі з'яўляцца каштоўныя экспанаты, і праз год адбылося адкрыццё музейнай экспазіцыі, сквера і алеі славы, прысвечаных Героям Савецкага Саюза 2-га гвардзейскага танкавага корпуса. На святе з гэтай нагоды было шмат гасцей, у тым ліку — прадстаўнікі гарадскога і нашага Фрунзенскага раённага выканкамаў, дэпутаты Нацыянальнага сходу, а таксама дэлегацыя з Масквы ў складзе Ю. А. Бурдзейнага, члена савета Рэгіянальнай грамадскай арганізацыі «Нацыянальна-культурная аўтаномія «Беларусы Масквы» М. І. Чахлова, старшыні Савета ветэранаў 2-га гвардзейскага Тацынскага танкавага корпуса М. Д. Чубарава, унучкі маршала бранятанкавых войскаў І. А. Лосік...

Сёння ў музеі больш за 170 экспанатаў у экспазіцыях «Памяць вогненных гадоў», «Баі 2-га гвардзейскага Тацынскага танкавага корпуса пры вызваленні Беларусі», «Партызанскі быт», «Ваенная амуніцыя» і іншых, з якімі змаглі пазнаёміцца каля пяці тысяч наведвальнікаў — школьнікаў Мінска, а таксама замежных гасцей з Расіі, Эстоніі, Францыі.

...Выхаванне патрыятызму, згадзіцеся, немагчымае без выхавання гонару за сваю радзіму, яе мінулае і сучаснае, без стварэння сістэмы па фарміраванні не толькі цікавасці да гісторыі, але і пазнавальнай дзейнасці.

У гэтым кірунку наша ўстанова адукацыі знайшла сваю нішу праз увекавечанне памяці герояў і паслядоўна рэалізуе яе — у тым ліку ў віртуальным музеі (sch157.minsk.edu.by).

Дырэктар школы С. М. СКРОЦКАЯ,
г. Мінск.

Свой погляд

«Не спяшацца б нам размахваць сякерай»

...Днямі, пераглядаючы ў шафе рэчы, убачыў ільняны ручнік. Яго мы купілі на сталічным Чэрвеньскім рынку, і яшчэ да вайны. Пасля яе на гэтай абнове мама вышыла сонейка і прыгожага чырвонага пеўня, а пад ім — словы «Добрай раніцы, мае дзеткі».

Дзесяцігоддзі прайшлі, а ручнік усё служыць, усё нагадвае мне пра дзіцячыя гады, пра маму Марыю Яўстаф'еўну, пра Чэрвеньскі рынак, раку Свіслач ды тыя драўляныя хаткі, што стаялі на вуліцы Маякоўскага, хоць на многіх з іх яшчэ захоўваліся шыльды з надпісам «Чэрвеньскі тракт».

Апошнім часам гэтыя хаткі знеслі, а разам з імі павысякалі прыгожы бэз, яблыні, грушы, вішні і слівы... Усё пайшло пад сякеру...

Неяк Ян Скрыган, якога я крыху ведаў, сказаў: будаўнікі — гэта разбуральнікі людскога жыцця: старое, яшчэ добрае, зносяць у надзеі, што новае будзе лепшым, прыгажэйшым за старое... Часам так яно бывае, але...

Кажуць, у Сербіі навучыліся будаваць, спалучаючы старое і новае, захоўваючы гармонію. Вось і нам, як здаецца, многае можна было б захоўваць, не спяшацца махаць сякерай над тым, што нагадвае пра нашу гісторыю, нашу духоўнасць.

Уладзімір ГОЛУБЕЎ,
г. Мінск.

Год малой радзімы

УСЕ ШЛЯХІ ПРЫВОДЗЯЦЬ НЕ ДА РЫМА,

а да родных вербаў і бяроз

Сёлета палеская вёска Пагост адзначыць свае 500! У гэтага паселішча — унікальнае месцазнаходжанне (цяпер яно ў складзе Нацыянальнага парку «Прыпяцкі») і багатая духоўная спадчына: тут дагэтуль жывуць самабытныя паданні і легенды, традыцыі і абрады, шматлікія рэліквіі ды сімвалы, песні — сапраўдныя культурныя каштоўнасці...

Выдатны падарунак сваім землякам з нагоды юбілею зрабіў ураджэнец вёскі — пісьменнік, кандыдат філасофскіх навук Міхась Кузьміч. Ён падрыхтаваў і выдаў кнігу «Мой Пагост». У ёй аўтар прасочвае гісторыю паселішча з часоў яго «нараджэння», сродкамі роднай мовы перадае гучанне і прыгажосць мноства мясцовых тапонімаў і расшыфроўвае іх значэнне, дае аб'ектыўную характарыстыку сацыяльна-эканамічнага развіцця, праўдзіва паказвае жыццё палешукоў, стварае іх яркія, запамінальныя вобразы.

Не абмінае аўтар кнігі і трагічныя перыяды ў жыцці Пагоста — яскрава адлюстроўвае падзеі, што адбываліся ў час Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў, у гады нямецка-фашысцкай акупацыі.

...Застаецца толькі дадаць, што «Мой Пагост» — гэта ўжо другое выданне кнігі, творча перапрацаванае і дапоўненае. Першае, рускамоўнае, выйшла ў 2018 годзе.

Міхась СЛІВА,
г. Рагачоў.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

Чалавек — чалавеку

Цяпло і падтрымка нават праз ежу перадаюцца

Валанцёры праекта «Дапамога бяздомным» па ўласнай ініцыятыве штодня кормяць гарачымі абедамі больш за сто чалавек, якія апынуліся на абочыне жыцця

У Алесі — яркія блакітныя вочы і прыгожая ўсмешка. На выгляд ёй гадоў 25, хоць яна — маці дваіх дзяцей. Працуе **Аляксандра САЛАЎЁВА** на фрылансе — піша тэксты. А ў вольны час пячэ салодкія прысмакі сацыяльнай сталоўцы, дзе валанцёры гатуюць ежу для бяздомных.

— Кулінарнай адукацыі ў мяне няма, — прызнаецца жанчына. — Проста смачна гатую. Аб праекце «Дапамога бяздомным» ГА «Водгук» даведалася выпадкова, патэлефанавала і пазнаёмілася з **Валерыем ЕРАНКЕВІЧАМ, куратарам праекта і кухарам** гэтай сталоўкі. Цяпер з ім дамаўляемся: на колькі людзей і што спячы.

— Але ж быць мамай — гэта нялёгкая праца, да таго ж — заказы на фрылансе. Навошта вам яшчэ і гатаваць для бяздомных?

— Проста шкада людзей, якія трапілі ў цяжкую сітуацыю. Грашыма я дапамагчы не магу, затое мая выпечка — гэта маленькая радасць, якая дае ім магчымасць вярнуць смакі жыцця і паверыць, што для іх яшчэ ўсё можа скласціся добра.

Інгрэдыенты для выпечкі Аляксандра часта купляе сама. Кажа, муж і дзеці падтрымліваюць яе ў валанцёрскай рабоце. А спячы пірог або торт на такую колькасць людзей, па словах Алесі, не так складана, як здаецца.

— На гэтым тыдні пякла аўсянае пячэнне, каля 200 штук. Зрабіла цеста, закінула печыва ў духоўку, на паўгадзіны забылася, дастала — і закідваю наступную партыю. А на будучым тыдні спяку шакаладны пірог.

Алеся — адна з валанцёраў у камандзе Валерыя Еранкевіча. Валанцёры грошай не атрымліваюць, працуюць па закліку сэрца. Кожную раніцу прыходзяць у будынак былога дзіцячага садка на Матусевіча, 15, каб бяздомныя маглі раз на дзень паесці гарачага. На кухні ў Валерыя старая пліта і некалькі электрычных плітак — вось і ўсё абсталяванне. Кожны дзень тут гатуюць ежу на 80-90 «сваіх» бяздомных (тых, што прыходзяць пастаянна) і яшчэ некалькі дзясяткаў пастаяльцаў Дома начнога знаходжання на Ваўпшасава — там знойдзены COVID-19, яны на каранціне.

— Вядома, я быў бы не супраць пашырыць кухню, але ж будынак не наш, мы толькі арандатары. І цана на арэнду расце пастаянна, — кажа Валерый.

ЗВЫЧАЙНАЯ ДАБРЫНЯ

— Мы заўсёды складаем меню на наступны дзень — з тых прадуктаў, якія ёсць у наяўнасці, — расказвае Валерый. — Але меню разнастайнае. Я стараюся, каб стравы не паўтараліся. З аднаго і таго ж невялікага набору прадуктаў магу прыгатаваць некалькі дзясяткаў страў.

Прадукты прывозяць людзі, крамы, арганізацыі.

— Мы звяртаемся праз СМІ і сацсеткі да тых, хто мог бы дапамагчы, — і людзі адклікаюцца. Бізнесмен пачуў пра нас, патэлефанаваў: магу даць бульбы. Фермер прывёз агародніны. Дапамагаюць пратэстанты і Чырвоны Крыж. Хтосьці дапамог рысам, хтосьці — макаронай. Квашаную капусту прывозяць арганізацыі, якія яе вырабляюць. Мы з яе гатуем запяканкі, супы, пудынгі. Хтосьці прыносіць леташняе варэнне — на морсы і ўзвары. Крамы даюць фрыкадэлькі, флякі, рыбныя кансервы, тушонку. Сёння, напрыклад, прывезлі проста з завода сардэлькі і вараную каўбасу — за грошы, але вельмі танна.

Не без гонару Валерый адзначае, што мяса ў меню сталоўкі ёсць кожны дзень. З курэй другой катэгорыі або курыных «спінак» атрымліваецца булён на першае, а варанае мяса кухар аддзяляе ад костак, здрабняе і пускае на гуляшы, гювеч з агароднінай або начынку для запяканак. Яшчэ адзін бюджэтны варыянт — мяса свіных галоў. Валерый гатуе з яго сальцісоны, зельцы, халадзец. Заўсёды ў меню салаты: вінегрэт, аліўе, нешта з сезонных.

— Бачу, што людзям падабаецца, — кажа суразмоўнік.

Як сапраўдны шэф-кухар, ён заўсёды выходзіць да наведвальнікаў і цікавіцца іх меркаваннем.

— Калі ў чалавека хворы страўнік, а на гарнір у мяне, напрыклад, тушаная капуста, падыходжу, раю: лепш вазьмі дзве порцыі першага ці нешта іншае, што ёсць на кухні.

«На ўсялякі выпадак» на кухні ў Валерыя Еранкевіча заўсёды што-небудзь ёсць: гасцей можа быць больш, чым чакалася.

Прыйсці ў сацыяльную сталоўку можа любы чалавек, у якога ў пашпарце няма штампа рэгістрацыі ці стаіць штамп Дома начнога знаходжання. Таксама тут бясплатна кормяць інвалідаў. Бо з пенсіі па інваліднасці пасля камунальных плацяжоў і набыцця фармацэўтычных прэпаратаў, няхай і па льготных цэнах, на ежу нярэдка застаецца 80-100 рублёў у месяц. Ёсць і яшчэ адна катэгорыя — Валерый вызначае яе як «людзі, якія апынуліся ў складанай сітуацыі». Напрыклад, нядаўна выйшлі з турмы.

— Часам, каб вярнуцца да нармальнага жыцця, патрэбна проста звычайная дабрыня, — тлумачыць Аляксандра. — Псіхалагічна тыя, хто прыходзіць да нас, проста не ведаюць, куды кінуцца, у каго прасіць дапамогі. Чалавечае цяпло і падтрымка — яны ж нават праз ежу перадаюцца.

ЯК СЭКАНОМІЦЬ НА ЕЖЫ

Пра мастацтва эканоміі Валерый Еранкевіч мог бы напісаць кнігу. Соусы, запраўкі ўласнага прыгатавання ў яго халадзільніку заўсёды захоўваюцца ў запас. Грыбы ён вырошчвае на цюках жытняй саломы, а свежую зеляніну — у кантэйнерах на падаконніках. І авёс малоціць сам з дапамогай адмысловай машынкі.

— Каб сэканоміць на ежы, трэба купляць тое, што табе неабходна, а не тое, што прапануюць. Калі ў цябе дзясятка на дзень, не раскоквай на 12 рублёў. А адзін раз на тыдзень можна і пасціцца: аўсяная каша, агародніна. Дапусцім, бяром вялікі агурок — з тых, якія сёння таннейшыя. Здымаем лупіну, лыжачкай дастаем насенне. Адварваем рыс, пасіруем цыбулю, дадаём дробна парэзанае мяса. Солім і перчым. Фаршыруем агурочныя «лодачкі» і запякаем у духоўцы. Смачна, як кабачок, нават яшчэ смачней! Можна так фаршыраваць і бульбу. Зверху добра б сыр, але часцей у мяне ёсць тварог. Я яго салю і перчу, узбіваю сырое яйка, змешваю. Пакрываю фаршыраваную бульбу гэтай масай — і ў духоўку. Смачна і прыгожа. Яшчэ варыянт: тую ж бульбу націраем на тарку для морквы. Бляху змазваем салам, пасыпаем сухарамі, выкладваем пласт бульбы і запякаем яго, як блін. Далей — агароднінная або грыбная начынка і наступны пласт бульбы. Зноў запякаем. І так некалькі слаёў. Атрымліваецца класічная беларуская бабка — духмяная і сакавітая.

Вядома, гэта ежа, якая патрабуе часу на прыгатаванне. З дарагіх прадуктаў гатаваць прасцей і хутчэй. З бюджэтных прадуктаў «на хуткую руку» можна рабіць амлеты — Валерый можа прапанаваць некалькі дзясяткаў варыянтаў.

Аднаразовы посуд, які сёння ў сувязі з пандэміяй абавязковы, — сур'ёзны выдатак для дабрачыннага праекта, які існуе толькі на ахвяраванні.

— Гэта мой галаўны боль, — дзеліцца Валерый. — 14 капеек плюс 7 капеек плюс 3 капейкі памнажаем на 110 чалавек і на 22 дні (па выхадных сталоўка не працуе). І атрымліваем, што ў месяц амаль 350 рублёў вылятае толькі на посуд.

Порцыі ў сталовай вялікія — частку абеду бяздомныя, як правіла, пакідаюць на вечар. Амаль 500 г першага, 250 г гарніру і каля 100 г мясной стравы. Плюс траціна батона на кожнага. На хлеб траціцца амаль 600 рублёў у месяц, кажа суразмоўца.

70 % гасцей сталоўкі — мужчыны, жанчын цяпер абедае мала. Улетку бяздомным пракарміцца лягчэй — ягады, грыбы, рыбалка. А ў халодную пару года сацыяльная сталоўкі для многіх — адзіны шанец не быць галодным.

ВЯРНУЦЦА ДА ЖЫЦЦЯ

Свой «кантынгент» Валерый ведае па імёнах. Агульная колькасць тых, хто за пяць гадоў харчаваўся ў яго сталоўцы, — 436 чалавек.

— Бывае, з'язджаюць кудынебудзь ці ў зняволенне трапляюць. Але часцей паміраюць. Хоць ёсць і тыя, хто прыстасаваліся, — яны жывуць так па 20 і больш гадоў. Ёсць у нас адзін вакзальны пастаялец, ён ужо 35 гадоў бамжуе. Ужо і думае зусім па-іншаму...

— А як думаюць бяздомныя?

— Жывуць мінулым, успамінаюць. Нехта — аб тым, як быў дырэктарам, нехта — аб тым, як быў ваенным, як жылі ў сям'і. І гэтым жывуць. Гэта вельмі страшна.

— Як трапляюць у такую сітуацыю?

— Часцей за ўсё гісторыя адна і тая ж: спіўся. Найбольш складана працаваць з тымі, хто стаў бяздомным нядаўна... Але мы верым: усім гэтым людзям можна дапамагчы. І дапамагаем.

Галоўная праблема для бамжа, які хоча вярнуцца да нармальнага жыцця, — працаўладкаванне. Пры прыёме на работу патрэбны пашпарт, у якім ёсць штамп аб рэгістрацыі. У бяздомных часта наогул няма дакументаў, а ўжо прапіскі няма ў 99 % падапечных праекта «Дапамога бяздомным». Можа быць штамп Дома начнога знаходжання на Ваўпшасава, але з такой «прапіскай» наўрад ці возьмуць на якую работу. Каб уладкавацца шафёрам, трэба прайсці медкамісію, грузчыкам часта патрэбна санкніжка. І за ўсё гэта трэба заплаціць. А ў бяздомнага няма грошай. Замкнёнае кола. Валанцёры дапамагаюць людзям, якія апынуліся на дне жыцця, аднавіць дакументы, даюць грошы на медкамісію для працаўладкавання.

— Хачу арганізаваць прытулак для бяздомных, — кажа Валерый. — Каб людзі маглі адчуць сябе дома, каб быў кавалак зямлі, дзе яны маглі б разбіць свой агародзік. І, галоўнае, каб іх можна было там «прапісваць». Цяпер мы разглядаем адзін будынак у Нясвіжскім раёне — гэта былая школа. Калі ўсё атрымаецца, некаторых бяздомных зможам працаўладкоўваць па месцы рэгістрацыі. У нас там ужо паўгектара маліннік. Будзем збіраць ягады, працаваць на зямлі. Побач ёсць закінутая майстэрня — нікому не была патрэбна. Як мы на яе вока паклалі — адразу ж арганізуецца аўкцыён. Цяпер вырашаем гэтае пытанне.

ДОЎГАЯ ГІСТОРЫЯ

Бедным людзям па ўсім свеце Валерый дапамагае больш за дваццаць гадоў. На пытанне, навошта яму гэта, адказвае:

— Доўгая гісторыя...

У пачатку 1990-х малады таленавіты хлопец быў шэф-кухарам аднаго з прэстыжных рэстаранаў Мінска. Ні ў чым не меў патрэбы, грошай хапала на ўсё, чаго хацелася. Стаў многа піць. І за некалькі гадоў спіўся. Мог страціць і работу, і сям'ю. Але здарыўся цуд — інакш Валерый гэтую падзею, што крута змяніла яго жыццё, не называе. Ён паверыў у Бога. Разам з жонкай прыняў хрышчэнне і вырашыў стаць місіянерам — дапамагаць людзям, якія апынуліся за мяжой беднасці, па ўсім свеце. Украіна, Славакія, Чэхія, Турцыя, Малдова, Расія... Гарачыя пункты, найбяднейшыя рэгіёны. Прытулкі для бяздомных, рэабілітацыя тых, хто вызваліўся з турмаў, алка- і нарказалежных. Жыллё і прапіску, дарэчы, Валерый таксама страціў — вярнуўся дадому пасля дваццаці гадоў сваіх падарожжаў, а сваякі яго кватэру даўно прадалі. Страціў і працоўны стаж — у яго ж не залічылі місіянерскую дзейнасць. Так што людзей, якія апынуліся на краі беднасці, мой суразмоўца не асуджае, як прынята ў нашым грамадстве. Ён упэўнены: калі вы думаеце, што такім людзям дапамагаць не трэба, будзьце гатовыя выпрабаваць іх лёс на ўласным вопыце.

Па словах Валерыя Еранкевіча, адказ на пытанне «Навошта вам гэта?» — просты. Калі ты бачыш, як гэтыя людзі, ад якіх адвярнулася грамадства, паступова вяртаюцца да нармальнага жыцця — перастаюць піць і думаць як раней, знаходзяць работу і сям'ю, — ты разумееш, што жывеш не дарэмна.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Фота з ўласнага архіва Валерыя ЕРАНКЕВІЧА.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Прызнаюся, прачытаўшы ў рукапісе апавяданне Віктара Варанца «Гарачы хлеб», я не паленаваўся пашукаць на прасторах інтэрнэту «Мемуары» князя Юсупава, каб пераканацца, ці праўда ў таго быў, як ён лічыў, самы адданы яму слуга Рыгор, які меў беларускія карані і ў выніку аказаўся вядомым злачынцам. А ўрэшце, што з таго, калі б, скажам, на самай справе слуга Рыгор быў, але ніякі не злачынца?! Мастацкі жанр дазваляе і не такія вольнасці ў абыходжанні з гістарычнымі фактамі. А пасля — як тут не згадаць Валянціна Пікуля, якога крытыка часта дакарала за гэтыя самыя вольнасці, нават прыдумала тэрмін «пікулярызацыя гісторыі», аднак папулярнасці творам пісьменніка ўсё гэта не замінала.

Алесь БАДАК.

Віктар ВАРАНЕЦ

ГАРАЧЫ ХЛЕБ

Ірына блукала па шматлікіх пакоях вялізнага палаца, нервова пазіраючы на гадзіннікі, што стаялі на падлозе, століках, віселі на сценах. Ужо дзве гадзіны, як Фелікс, яе каханы муж, павінен быць дома. На вуліцы добра сцямнела, там-сям чуліся стрэлы, крыкі, рэзкія каманды. Восенню 1917 года ў Петраградзе было неспакойна, і таму Ірына не знаходзіла сабе месца. Але вось заблямкаў званочак на ўваходзе, пачуліся крокі пакаёўкі, і праз хвіліну ў пакой увайшоў высокі, хударлявы, з іканапісным тварам візантыйскага пісьма мужчына. Князь Фелікс Феліксавіч Юсупаў, граф Сумарокаў-Эльстан. Ірына Аляксандраўна, дачка вялікага князя Аляксандра Міхайлавіча і вялікай княгіні Ксеніі Аляксандраўны, сястры Мікалая II, са слязьмі на вачах кінулася мужу на шыю.

— Фелікс, ну як так можна, я ўся на нервах! Дзе ты быў?

Юсупаў пяшчотна пагладзіў жонку па валасах, узяў пад руку і пасадзіў у глыбокае крэсла. Сам сеў насупраць і доўга, цёпла глядзеў на сваю Ірыну.

— Ірына, — мякка загаварыў Фелікс, — выслухай мяне ўважліва і пастарайся зразумець. Часовы ўрад сёння-заўтра падзе. Гэта ўжо факт. Усе дзяржаўныя пасады займуць камісары-яўрэі з рускімі псеўданімамі. У сталіцы поўны вэрхал. Імператрыца Марыя Фёдараўна, Вялікі князь Аляксандр Міхайлавіч, Вялікая княгіня Вольга Аляксандраўна з мужам тайна ад'ехалі ў Крым у суправаджэнні адданага атрада сапёраў. Сёння апоўначы туды ж адпраўляецца спецыяльны цягнік з рэчамі імператарскай сям'і. Я дамовіўся, і да цягніка прычапілі пасажырскі вагон. Гэта наш апошні шанц пакінуць сталіцу і застацца жывымі.

Княгіня прыпала галавой да пляча Юсупава і гучна зарыдала.

Фелікс прыабняў жонку за плечы:

— Збярыся, Ірына. Не час на слёзы. Ты павінна захаваць мужнасць і вытрымку.

— Я толькі слабая жанчына, — скрозь слёзы прамармытала Ірына. — Я не хачу быць мужнай і вытрымаў. Я хачу жыць як раней.

— Хутка гэта ўсё скончыцца, — пачаў супакойваць яе Фелікс, — і мы абавязкова зажывём як раней. Толькі перавешаем гэтую чэрнь. Збірайся!

Ірына з жахам зірнула ў вочы мужа.

Князь Юсупаў накіраваўся ў свой кабінет, дзе яго даўно чакаў слуга Рыгор. Пры з'яўленні гаспадара ён ускочыў з крэсла і нізка пакланіўся.

— Сядайце, Рыгор, — указаў рукой на крэсла Юсупаў. — Хачу даручыць вам адну надзвычай важную справу. Вы, Рыгор, самы адданы чалавек нашай сям'і, і гэты сакрэт я магу даверыць толькі вам.

— Я слухаю, пане! — зноў ускочыў слуга.

— Не скачыце, калі ласка! — зморшчыўся Юсупаў. — Сёння вы сядзеце ў цягнік і даедзеце да Вільні. Там у купэ зойдзе чалавек і запытае: «Вы Павел Бурэ?» Вы адкажаце: «Павел Бурэ — гэта гадзіннік». Гэты чалавек даставіць вас у Швейцарыю, дзе і будзеце чакаць майго прыезду. І ведайце: ваша адданасць будзе добра ўзнагароджана ў Швейцарыі.

— А як доўга мне трэба будзе чакаць пана? — запытаўся слуга.

— Думаю, тры-чатыры тыдні. Жыць будзеце ў гатэлі, сакваяж памясціце там жа ў сейф. Пражыванне, харчаванне аплачана. Вось новы пашпарт і грошы на дробныя выдаткі.

Юсупаў працягнуў тоўсты партманет мужчыну. Рыгор яшчэ раз зірнуў адданымі вачыма на князя, цяжка ўздыхнуў, узяў кашалёк і дакументы.

«Дзякуй богу, хоць у гэтым чалавеку я магу быць упэўнены», — падумалася Юсупаву.

Князь пра ўсё паклапаціўся. Ён выкупіў для Рыгора цэлае купэ, і слуга ехаў, як важны вяльможа, адзін. Мужчына ў задуменнасці гартаў свае новыя дакументы на імя Веласа Яна Іванавіча. Паклаўшы пашпарт на стол, ён падняўся, зачыніў дзверы купэ і выцягнуў з-пад лавы сакваяж. Замок на ім быў зачынены. Рыгор усміхнуўся, дастаў з кішэні невялічкую звязку ключоў, адмычак, выбраў патрэбную і пачаў паволі корпацца ў замку. Праз хвіліну пачуўся лёгкі шчаўчок — і сакваяж адкрыўся. Рыгор высыпаў усё змесціва на суседнюю канапу і міжволі прысвіснуў: смарагды, сапфіры, дыяменты, рубіны ў срэбры і золаце, каштоўныя брошкі, дыядэмы, калье зіхацелі і пераліваліся, гіпнатызуючы сваёй прыгажосцю. Гэта былі не проста каштоўнасці, а сапраўдныя шэдэўры ювелірнага мастацтва. Ён акуратна склаў скарбы назад у сакваяж, зачыніў і паставіў на месца. А сам задаволена адкінуўся на спінку канапы.

Так, час быў патрачаны недарэмна. Чатыры гады таму дваццацітрохгадовы ўраджэнец невялічкага правінцыяльнага гарадка Гродна, што месціцца ў самым дальнім куточку Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі, Рыгор Панасавіч Салавей прыехаў у Санкт-Пецярбург і вырашыў уладкавацца на працу. Беларусаў ахвотна наймала сталічная арыстакратыя ў слугі, пакаёўкі, аканомы, бо тыя былі заўсёды сумленныя, рахманыя і адданыя сваім гаспадарам. Рыгорка праз аднаго з землякоў досыць хутка ўладкаваўся слугой да Фелікса Юсупава. Увішны, нястомны, з умелымі рукамі, Салавей спадабаўся маладым гаспадарам і ўжо праз год стаў самай даверанай асобай з усёй прыслугі ў Фелікса Феліксавіча.

— У ім я ўпэўнены як ў сабе! — не раз гаварыў Юсупаў знаёмым. Грышка, калі чуў такія словы, толькі апускаў долу вочы і сціпла ўсміхаўся. Зразумела, князь і не здагадваўся, што ў сваім родным Гродне Рыгор Салавей быў вядомай асобай. Нягледзячы на малады ўзрост, ён у крымінальным асяроддзі лічыўся самым умелым «мядзведнікам», для якога не існавала ў свеце сейфаў, што нельга было б узламаць. Адна з праведзеных аперацый прымусіла хлопца з'ехаць на пэўны час з Гродна. І тут добрай схованкай ад паліцыі стаў дом Юсупавых. Каб не страціць кваліфікацыю, Рыгор час ад часу «зазіраў» у чужыя скарбонкі, але яго асноўнай мэтай быў сейф Юсупава. І бачыш, як распарадзіўся лёс: скарбы самі прыйшлі ў Рыгоравы рукі.

На станцыі Дзвінск Салавей з сакваяжам у руках выйшаў з вагона і пакрочыў да білетных кас. Вільня ніяк не ўваходзіла ў планы хлопца. Яму трэба трапіць у Маладзечна, а там з дапамогай добрых знаёмых перабрацца праз нямецкую лінію акупацыі ў роднае Гродна...

Мікіта Балько сядзеў у невялікай чытальнай зале абласной бібліятэкі зусім адзін, калі не лічыць немаладую супрацоўніцу. Зрэшты, так было і ўчора, і пазаўчора. 1991 год быў не самым спрыяльным годам для навуковай дзейнасці. Сябры па юрыдычным факультэце вольны час трацілі з большай ахвотай на паездкі ў суседнюю Польшчу, каб зарабіць колькі долараў на якое адзенне ці абутак. Жыць на стыпендыю было немагчыма. Якая тут бібліятэка? Балько ж любіў вучыцца, галеча яго не палохала, а сялянская жылка ўсё даводзіць да лагічнага канца спадабалася загадчыку кафедры крымінальнага права і крыміналістыкі. Ён і прапанаваў студэнту заняцца навукай.

— Разумееце, Мікіта, гісторыя развіцця грамадства падказвае, што часы ператрусаў абавязкова заканчваюцца, і грамадству абавязкова спатрэбіцца навуковая эліта. За гэты неспакойны час вы можаце закончыць універсітэт, паступіць у аспірантуру і абараніць дысертацыю. Задаткі для гэтага ў вас ёсць, працалюбства прысутнічае, чаму б не паспрабаваць?

Навуковы кіраўнік даў Мікіту заданне сабраць матэрыял па гісторыі крымінальных спраў у Гродне першай паловы дваццатага стагоддзя. І зараз хлопец перагортваў старонкі гарадзенскай газеты Grodner Express за 1936 год, з цяжкасцю перакладаючы з польскай мовы крымінальныя навіны. Неўзабаве яму на вочы трапіў невялічкі артыкул «Tajemnicza mierz we wiasnym domu». Мікіта пачаў уважліва чытаць.

«28 жніўня ў сваім доме на вуліцы Грандзіцкай, 29 было знойдзена прыслугай цела вядомага мецэната, прамыслоўца і грамадскага дзеяча нашага горада Яна Веласа. Цела памерлага без слядоў гвалту ляжала каля стала ў рабочым кабінеце. Па словах прыслугі, нічога з кватэры не знікла. Аднак паліцыя, як стала вядома нашаму карэспандэнту, не знайшла ў доме славутай калекцыі каштоўнасцяў Веласа. Таксама застаецца загадкай, адкуль узяўся ў сейфе пашпарт 1913 года з фотаздымкам забітага, выпісаны на імя Салаўя Рыгора Панасавіча, і якім чынам у кішэні Веласа аказалася дыядэма з надпісам «Каханай Ірыне ад мужа. Фелікс Юсупаў». Паліцыя лічыць, што Ян Велас памёр ад сардэчнага прыступу. Гэтую версію пацвердзілі і патолагаанатамы. Следства працягваецца».

Мікіта адсунуў газету і на хвіліну задумаўся. Нешта вельмі знаёмае прамільгнула ў гэтым артыкуле. Але што? Балько зноў схіліўся над газетай, прабягаючы вачыма па выцвілых ад часу радках. «Так, Ян Велас, вуліца Грандзіцкая, 29, сейф, пашпарт, Рыгор Салавей... Стоп!»

Мікіта ажно падскочыў у крэсле. Рыгор Салавей! Гэтае прозвішча ён сустракаў зусім нядаўна. І нават рабіў нейкія выпіскі. 1913 год, Гродна... Так, інфармацыя была ў «Гродзенскім весніку». Здаецца, пра абрабаванне нейкага купца. Мікіта хуценька сабраўся і пабег дахаты. Ён дастаў з паліцы тоўсты сшытак, сеў на ложак і пачаў гартаць. Ага, вось гэты запіс. «7 студзеня 1913 года было азмрочана ў Гродне двума прыкрымі здарэннямі. Уначы невядомыя абрабавалі дом купца Іосіфа Індурскага па вуліцы Паліцэйскай, 5. У адсутнасць сям'і пацярпелага зладзеі ўзламалі сейф з вельмі складаным замком і выкралі, па інфармацыі самога Індурскага, амаль дзевяць тысяч рублёў, падрыхтаваных для куплі новага памяшкання пад краму. А ўжо раніцай паступіла інфармацыя ў пажарную каманду горада, што на вуліцы Грандзіцкай, 29 гарыць прыватны дом. Калі пажарныя прыбылі на месца пажару, іх сустрэла толькі папялішча, а сярод вугалля і попелу ляжалі абгарэлыя косці невядомага. Паліцыя лічыць, што гэта, магчыма, рэшткі гаспадара дома Рыгора Салаўя. Цікавая інфармацыя: па звестках паліцыі, Рыгор Салавей быў вядомы ў крымінальным асяроддзі як вельмі таленавіты спецыяліст па ўзломе сейфаў».

Усё гэта вельмі зацікавіла Мікіту. Ён узяў чысты аркуш паперы, аловак і пачаў малюваць кругі, разважаючы ўслых.

— Вось гэта Ян Велас, які жыў на вуліцы Грандзіцкай, 29. А гэта Рыгор Салавей, які таксама жыў на Грандзіцкай, 29. Ян і Рыгор — адна і тая ж асоба? А чаму не? Жылі яны ў адным і тым жа месцы, толькі з розніцай у дваццаць гадоў. Калі дапусціць, што Салавей інсцэніруе сваю смерць і знікае з горада пасля абрабавання Індурскага, а праз пэўны час вяртаецца ў Гродна, будуе дом на месцы спаленага і становіцца прамыслоўцам. Грошы Індурскага, скрадзеныя ў кагосьці каштоўнасці — нядрэнны стартавы капітал для бізнесу. Адседзеўся недзе, пакуль шукала паліцыя, а тут грамадзянская вайна, акупацыя горада немцамі, потым палякамі. Каму да яго справа? Ды і вярнуўся не Рыгор Салавей, а Ян Велас, багаты чалавек, мецэнат. Ён жа вопытны злодзей і мог спакойна прыстасавацца да любой улады. І пашпарт на імя Салаўя таму доказ. А што са скарбамі? Хутчэй за ўсё, схаваны дзесьці ў доме. Каму яшчэ іх даверыць прафесійны злодзей?»

Было далёка за поўнач. Мікіта адзін сядзеў у інтэрнацкай чытальцы, спрабуючы прывесці думкі да парадку. Ён знайшоў сёння дом Веласа. Будынак з нумарам 29 па вуліцы Грандзіцкай і сёння мае той жа нумар 29, толькі вуліца цяпер Горкага. І зараз там месціцца магазін «Гарачы хлеб». Хлопец абышоў магазін з розных бакоў, пабываў унутры, нават накідаў невялічкі план гэтага дома. Дык дзе мог схаваць скарбы Велас?

«Пад дахам? Не, дах рамантуецца часцей за ўсё, таму схованка зусім не надзейная. У адным з пакояў? Магчыма, але апошнім часам у доме рабілі поўную перапланіроўку жылых памяшканняў: нейкія сцены разбуралі, новыя ставілі, каб было зручна для пакупнікоў. Каб што знайшлі, дык паўсюль бы напісалі. Таму наўрад ці. Застаецца падвал. Калі там нешта і рабілі, дык, мяркую, чыста касметычна: навошта хлебнаму магазіну падвал? Вось дзе і можа быць схованка. Але як трапіць у гэты падвал? Не пойдзеш жа да загадчыка магазіна з просьбай пусціць там пашвэндацца. Хаця чаму, гэта нядрэнная ідэя!..»

Раніцай наступнага дня Мікіта ціхенька пастукаў у дзверы са сціплай шыльдачкай «Дырэктар».

— Уваходзьце! — пачуўся жаночы голас.

Балько пераступіў парог і апынуўся ў зусім маленькім пакойчыку, дзе мясціліся толькі стол, крэсла з дырэктарам і яшчэ адно вольнае крэсла.

— Слухаю вас, — прыветна ўсміхнулася дырэктарка.

— Добры дзень! — прывітаўся Мікіта. — Я Мікіта Балько, студэнт Гродзенскага ўніверсітэта і хацеў бы ўладкавацца да вас на падпрацоўку грузчыкам ці якім падсобным рабочым, калі ёсць такая магчымасць.

Жанчына ад такой просьбы ажно засвяцілася.

— Сядайце, калі ласка, — яна паказала рукой на крэсла. — Вы не паверыце, а я з раніцы ламаю галаву, дзе мне знайсці грузчыка хоць бы на месяц. Зарплата ў нас, зразумееце, не вельмі, таму працуюць у асноўным выпівохі. А трымаюцца яны, як правіла, да першых грошай. А тут вы!..

Назаўтра пасля заняткаў Мікіта прыступіў да працы. Ён сумленна цягаў латкі з хлебам, перасоўваў па зале мяхі з мукой і бясконца адбіваўся ад настойлівых прапаноў новых калег адзначыць першы рабочы дзень. Калі магазін зачынілі і расчараваныя паводзінамі хлопца прадаўшчыцы пайшлі дахаты, Мікіта нарэшце заняўся пошукамі. Яшчэ днём ён пераканаўся, што падвал не зачыняецца, а дзверы ў яго проста завязаны дротам. Хлопец выцягнуў з сумкі прыпасены ліхтарык, турыстычную сякерку і спусціўся ў падвал. На здзіўленне, там уключалася электрычнасць, і перад шукальнікам адкрылася прасторнае, хоць і нізкае памяшканне. Тут валяліся паламаныя крэслы, стаялі бляшанкі з фарбай ці ад фарбы, нейкія скрыні, латкі.

Мікіта пачаў педантычна ачышчаць падлогу ў падвале, прастукваючы масніцы. І яго ўпартасць неўзабаве была ўзнагароджана. Адна з дошак глуха загула. Балько хуценька ўзяў сякерку і пачаў выломваць дошку. Са скрыпам яна выскачыла з пазоў, адкрыўшы нейкую пустату. Мікіта адарваў яшчэ некалькі дошак і ўбачыў круглае вечка люка з вялікім стальным кольцам пасярэдзіне. Ён паспрабаваў падняць накрыўку, але тая нават не зварухнулася. «Патрэбны лом», — падумаў хлопец. У магазіне лома, на жаль, не было. Балько акуратна закрыў дошкамі дзірку ў падлозе і рушыў у інтэрнат. Там за рубель пазычыў лом у вахцёра і ў прыўзнятым настроі пабег назад...

Мікіта ўжо выразна ўяўляў, як ён знойдзе пад люкам велізарныя каштоўнасці, верне іх чалавецтву, і ў яго пачнуцца бясконцыя інтэрв'ю, відэаздымкі, прэс-канферэнцыі. Лунаючы ў сваіх летуценнях, Мікіта пачаў пераходзіць вуліцу Астроўскага і не заўважыў, што злева на поўнай хуткасці на чырвонае святло ляціць старэнькі «Масквіч». Віск тармазоў, глухі ўдар — і бясформенным камяком адкінутае цела хлопца стукнулася аб слуп. А п'яны кіроўца аўтамабіля, пляснуўшыся лбом аб руль, тут жа захроп цяжкім хмяльным сном.

Мікіта ў бальніцы так і не апрытомнеў. А праз суткі быў пахаваны ў роднай вёсцы. Аднакурснікі, выкладчыкі, прадаўцы «Гарачага хлеба» пэўны час абмяркоўвалі гэтае страшнае здарэнне і лом, які нёс кудысьці Мікіта. Але час робіць сваю справу, і ўсё радзей у гутарках згадваўся Мікіта Балько і яго заўчасная смерць. Жыццё ішло наперад...

Гістарычная даведка. Рашэннем гарадзенскіх улад 6 кастрычніка 2006 года дом на вуліцы Горкага, 29, помнік архітэктуры канструктывізму, быў поўнасцю разбураны. На яго месцы пакуль нічога не пабудавалі.

ФРАНСАБАНК FRANSABANK

«Франсабанк» Открытое акционерное общество

Республика Беларусь,
г. Минск, пр-т Независимости, 95А
тел. (017) 389 36 36, факс (017) 389 36 37
office@fransabank.by www.fransabank.by

Финансовая отчетность за 2019 год

Отчет о финансовом положении на 31 декабря 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	Прим.	2019 год	2018 год
Активы			
Денежные средства и счета в Национальном банке Республики Беларусь	5	31 401	21 121
Средства в банках	6	10 650	6 644
Кредиты клиентам	7	78 569	75 417
Инвестиционные ценные бумаги, оцениваемые по ССПСД	8	22 842	7 038
Инвестиционные ценные бумаги, оцениваемые по амортизированной стоимости	9	7 937	14 815
Основные средства и нематериальные активы	10	16 785	15 572
Текущие активы по налогу на прибыль		89	–
Отложенные активы по налогу на прибыль	11	1 018	998
Прочие активы	12	1 080	1 323
Итого активы		**170 371**	**142 928**
Обязательства			
Средства банков	13	–	8 943
Средства клиентов	14	106 019	70 148
Выпущенные долговые ценные бумаги	15	–	923
Текущие обязательства по налогу на прибыль		–	97
Прочие обязательства	12	2 292	756
Субординированный заем	16	16 694	17 165
Итого обязательства		**125 005**	**98 032**
Собственный капитал			
Уставный капитал	17	53 664	53 664
Непокрытый убыток		(8 298)	(8 768)
Итого собственный капитал		**45 366**	**44 896**
Итого собственный капитал и обязательства		**170 371**	**142 928**

Отчет о совокупном доходе за год, закончившийся 31 декабря 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	Прим.	2019 год	2018 год
Процентные доходы, рассчитанные с использованием эффективной процентной ставки		10 481	8 497
Прочие процентные доходы		254	102
Процентные расходы		(4 398)	(3 352)
Чистые процентные доходы	19	**6 337**	**5 247**
Расходы по кредитным убыткам	20	(27)	(343)
Убыток от модификации кредитов	7	(44)	–
Чистые процентные доходы после расходов по кредитным убыткам		**6 266**	**4 904**
Комиссионные доходы		2 497	2 361
Комиссионные расходы		(377)	(421)
Чистые комиссионные доходы	21	**2 120**	**1 940**
Чистая прибыль по операциям с иностранной валютой - торговые операции		4 938	5 169
- переоценка валютных статей		(396)	(321)
(Расходы)/восстановление резервов под обесценение по прочим операциям	20	(248)	362
Восстановление обесценения основных средств		–	3 068
Прочие доходы	22	153	349
Непроцентные доходы		**6 567**	**10 567**
Расходы на персонал	23	(5 205)	(4 802)
Амортизация	10	(1 324)	(729)
Прочие операционные расходы	23	(4 893)	(5 155)
Непроцентные расходы		**(11 422)**	**(10 686)**
Прибыль до расходов по налогу на прибыль		**1 411**	**4 785**
Расходы по налогу на прибыль	11	(151)	(1 073)
Чистая прибыль за год		**1 260**	**3 712**
Прочий совокупный доход		–	–
Итого совокупный доход за год		**1 260**	**3 712**

Отчет об изменениях в собственном капитале за год, закончившийся 31 декабря 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	Уставный капитал	Непокрытый убыток	Итого собственный капитал
Остаток на 1 января 2018 г.	**49 736**	**(10 573)**	**39 163**
Совокупный доход за год	–	3 712	**3 712**
Пополнение уставного фонда за счет средств субординированного займа (Примечание 17)	3 928	–	**3 928**
Дивиденды объявленные и выплаченные	–	(1 907)	(1 907)
На 31 декабря 2018 г.	**53 664**	**(8 768)**	**44 896**
Влияние применения МСФО (IFRS) 16 (Примечание 3)	–	(4)	**(4)**
Остаток на 1 января 2019 г., пересчитанный в соответствии с МСФО (IFRS) 16	**53 664**	**(8 772)**	**44 892**
Совокупный доход за год	–	1 260	**1 260**
Дивиденды объявленные и выплаченные	–	(786)	**(786)**
На 31 декабря 2019 г.	**53 664**	**(8 298)**	**45 366**

Отчет о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	Прим.	2019 год	2018 год
Денежные потоки от операционной деятельности			
Прибыль до налогообложения		1 411	4 785
Корректировки			
Формирование резервов по кредитным убыткам	20	27	343
Убыток от модификации договорных условий по кредитам	7	44	
Формирование/(восстановление) резервов по прочим операциям	20	248	(362)
Амортизация основных средств и нематериальных активов	10	1 324	729
Убыток от выбытия основных средств, нематериальных активов и прочего имущества	23	–	(179)
Курсовые разницы		396	321
Чистое изменение начисленных процентных доходов и расходов		(50)	899
Чистый убыток от продажи инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по ССПСД		(15)	(20)
Восстановление обесценения основных средств		–	(3 068)
Чистое изменение прочих начисленных доходов и расходов		38	34
Денежные потоки от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах		**3 423**	**3 482**
Чистое увеличение/(уменьшение) операционных активов			
Обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь	5	(431)	(226)
Средства в банках		11	(163)
Кредиты клиентам		(4 326)	(27 437)
Прочие активы		(230)	(349)
Чистое увеличение/(уменьшение) операционных обязательств			
Средства банков		(8 856)	7 478
Средства клиентов		36 069	17 330
Прочие обязательства		133	327
Чистые денежные потоки от операционной деятельности до налога на прибыль		**25 793**	**442**
Уплаченный налог на прибыль	11	(357)	(555)
Чистое поступление денежных средств по операционной деятельности		**25 436**	**(113)**
Денежные потоки от инвестиционной деятельности			
Приобретение основных средств и нематериальных активов	10	(444)	(660)
Поступления от реализации основных средств и нематериальных активов		–	184
Приобретение инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по ССПСД		(30 755)	(21 724)
Погашение и продажа инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по ССПСД		15 445	21 815
Приобретение инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по амортизированной стоимости	9	(149 460)	(92 640)
Погашение и продажа инвестиционных ценных бумаг, оцениваемых по амортизированной стоимости	9	155 879	90 398
Чистое расходование денежных средств по инвестиционной деятельности		**(9 335)**	**(2 627)**
Денежные потоки от финансовой деятельности			
Дивиденды, выплаченные акционерам Банка	17	(786)	(1 907)
Поступления от выпуска собственных долговых ценных бумаг	15	–	900
Покупка и погашение собственных долговых ценных бумаг	15	(879)	–
Платежи по аренде	12	(505)	–
Чистое расходование денежных средств в финансовой деятельности		**(2 170)**	**(1 007)**
Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты		(71)	581
Чистое увеличение/(уменьшение) денежных средств и их эквивалентов		**13 860**	**(3 166)**
Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного года	5	26 712	29 878
Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного года	5	**40 572**	**26 712**

Сумма процентов, уплаченных и полученных Банком в течение года, закончившегося 31 декабря 2019 г., составила 4 388 тыс. бел. руб. и 10 474 тыс. бел. руб. соответственно.
Сумма процентов, уплаченных и полученных Банком в течение года, закончившегося 31 декабря 2018 г., составила 3 382 тыс. бел. руб. и 8 459 тыс. бел. руб. соответственно.

Подписано и утверждено к выпуску от имени Правления Банка:

Омельянчик Д.И. — И.о. Председателя Правления

Дорофей Т.В. — Главный бухгалтер

7 мая 2020 г.

УНП 100755021

EY Совершенствуем бизнес, улучшаем мир

Ernst & Young LLC
Klary Tsetkin st, 51A, 15 th floor
Minsk, 220004, Republik of Belarus
Tel: +375 (17) 240 4242
Fax: +375 (17) 240 4241
www.ey.com.by

ООО «Эрнст энд Янг»
Республика Беларусь, 220004, Минск
ул. Клары Цеткин, 51А, 15-й этаж
Тел.: +375 (17) 240 4242
Факс: +375 (17) 240 4241

Аудиторское заключение независимой аудиторской организации по финансовой отчетности «Франсабанк» Открытого акционерного общества за период с 1 января по 31 декабря 2019 года

И.о. Председателя Правления
«Франсабанк» Открытого акционерного общества
Г-ну Д.И. Омельянчику

Акционерам, Наблюдательному совету, Аудиторскому комитету и Правлению
«Франсабанк» Открытого акционерного общества

Мнение
Мы провели аудит финансовой отчетности «Франсабанк» Открытого акционерного общества (далее – «Франсабанк» ОАО или «Банк»), состоящей из отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2019 года, отчета о совокупном доходе, отчета об изменениях в капитале и отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к финансовой отчетности, включая краткий обзор основных положений учетной политики.

По нашему мнению, прилагаемая финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных отношениях финансовое положение Банка по состоянию на 31 декабря 2019 года, а также его финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (МСФО).

Основание для выражения мнения

